
Ніва

БЕЛАРУСКІ ТЫДНЁВІК

№ 31 (910) ГОД XVIII БЕЛАСТОК 5 ЖНІЎНЯ 1973 г. ЦАНА 60 гр.





Вера Іваноўская — актывістка гміннага праўлення ЗСМВ у Мельніку.

ЭКЗАМЕН НА „ВЫДАТНА"

Усмажлівы поўдзень. На „беластоцкім" і „варшаўскім" берагах Буга боўтаюцца ў вадзе або пякуцца на пяску адпачываючыя. Сярэдзінай ракі плыве стадка байдарак-каякоў. Надбужжа адпачывае.

А ў Мельніку, на Тапаліне — самым прыгожым месцы мельніцкага пабярэжжа Буга — дружна звоняць малаткі, енчаць пілы, шоргаюць гэблі. Мельніцкая моладзь пад кірункам старэйшага чалавека, відаць, вопытнага столяра, завіхаецца каля работы. Хлопцы носяць смалістыя сасновыя дошкі, дапасоўваюць, рэжуць, прыбіваюць. Спяшаюцца. Дзе які з іх зірне з трывогай на сыходзячае з поўдня сонца, абмахне далонню пот з твару і зноў бярэцца за работу. Праца ж павінна быць закончана яшчэ сёння, бо заўтра сюды, у Мельнік, на Тапаліну, з'едзецца моладзь з усяго Сямяціцкага павету. І як тады гасцям у вочы глянуць, калі што-небудзь будзе недароблена?! Будуюць жа мельнічане дасканалыя рэчы: ангар на трыццаць байдарак, рачную прыстань і прасторную пляцоўку для танцаў.

— Чаму павятовы злёт Саюза сацыялістычнай вясковай моладзі праводзім якраз у Мельніку? — перапытвае Станіслаў Тарасюк, сакратар павятовага праўлення ЗСМВ, які прыехаў у Мельнік, каб глянуць, як ідзе падрыхтоўка да заўтрашняга свята. — Па-першае, таму што дэлегат нашага павету на Агульнапольскі злёт моладзі ў Кракаве паходзіць з Мельніка. Ён працуе тут на прадпрыемстве па здабыццю крэйды. Гэта Люцыян Урбанскі — старшыня гміннага праўлення нашай арганізацыі. Па-другое, хочам паказаць моладзі ўсяго нашага павету прыгажосць Мельніка. Заўсёды так бывала, што ўсе мерапрыемствы праводзіліся ў Драгічыне або Цеханоўцы, а Мельнік заставаўся збоку. Цяпер жа большасць нашых мерапрыемстваў, будзем праводзіць тут, у Мельніку Неўзабаве пасля злёту арганізуем тут інструктажна-адпачынкавы лагер для актыву нашай арганізацыі, потым падумаем і пра іншыя мерапрыемствы.

(Працяг на стар. 4)



Начальнік Мельніцкай гміны Ян Здуневіч.

СУСТРЭЧЫ З ЗЕМЛЯКАМІ

АДУКАЦЫЯ СТАНОВІЦЦА НЕАЦАНІМЫМ БАГАЦЦЕМ НАРОДА...



— У гэтым годзе, Годзе польскай навукі, святкуем таксама 200-годдзе стварэння Камісіі народнай адукацыі. Што Вы, — звяртаюся да др Мікалая Вінярскага, — як спецыяліст па педагагічных навуках, навукова-дыдактычны супрацоўнік Варшаўскага універсітэта маглі б сказаць пра актуальныя праблемы педагагічных навук у Польшчы?

— У сувязі з буйным развіццём навукі фактар адукацыі адыгрывае штораз больш істотную ролю ў жыцці кожнага грамадства. Таму ў сучасны момант усё больш увагі прысвячаем фарміраванню структуры школьнай сістэмы. Каб павысіць узровень адукацыі, імкнемся сярэднюю школу ператварыць у школу ўсеагульную. У кругах вучоных, як тэарэтыкаў, так і практыкаў, вядзецца ажыўленая дыскусія, у рамках якой аналізуюцца прадстаўленыя асветнымі ўладамі прапановы мадэрнізаванай школьнай сістэмы. Удзел вучоных-педагогаў у гэтых працах даволі вялікі. У праектаваных у даны момант даследчых працах па педагогіцы плануецца разгляд праблем, якія адносяцца да павышэння выхаваўчай і навучальнай эфектыўнасці сучаснай школы. У цэнтры зацікаўлення педагагічнай тэорыі знаходзіцца канцэпцыя суцэльнай школьнай сістэмы. Па-за арганізацыйнымі праблемамі школьнай сістэмы вялікая ўвага звяртаецца таксама на ўдасканальванне тэхнікі навучання. Важнай праблемай з'яўляюцца таксама пошукі мадэлі падрыхтоўкі настаўнікаў, якія маюць рэалізаваць сучасны дыдактычна-выхаваўчы працэс.

— А над чым Вы асабіста цяпер працуеце?

— Прысвяціўшы сябе навуцы, у большай ці меншай ступені, чалавек займаецца галоўным чынам тым, што яго найбольш цікавіць. Так справы выглядаюць і ў мяне. Цікавіць мяне якраз праблематыка, якая цяпер вельмі актуальная, менавіта праблематыка аптымалізацыі мадэлі пачатковай школы. Займаюся праблемай умацнення выхаваўча-апякунчай ролі школы. Звязана з гэтай праблемай метадалогія акрэслівання эфектыўнасці працы школы, распрацоўка крытэрыяў ацэнкі гэтай эфектыўнасці, аб'ём і кірункі ўзаемадзеяння паміж школай і сям'ёй у рэалізацыі выхаваўчых задач, мадэль каардынацыі апякунча-выхаваўчай працы ў месцы жылля. Справамі гэтымі займаюся як удзельнік даследчага калектыву, які пад кіраўніцтвам дац. др габ. Ежы Волчыка ў Інстытуце педагогікі Варшаўскага універсітэта распрацоўвае праблематыку школы ў паасобным асяроддзі.

— Як Вы, наш зямляк, ураджэнец Ракавіч, ацэньваеце актуальны стан школьніцтва на Беласточчыне?

— Не мог бы я даць поўнай ацэнкі ў гэтай галіне, паколькі невядомы мне шырэйшыя даследчыя працы над школьніцтвам на Беласточчыне; здаецца мне, што такія шырокія доследы не праводзіліся, хоць гэта школьніцтва якраз вымагае такіх доследаў. На падставе спарадычных нагляданняў, бо Беласточчыну я часта наведваю, а таксама маю там многа калег, якія працуюць у асноўным у пачатковых школах, магу сказаць наступнае: што датычыць

(Працяг на стар. 4)

БГКТ ХРОНІКА

■ Адной з важнейшых задач Беларускага таварыства з'яўляецца развіццё мастацкай самадзейнасці. Спрыяюць гэтаму пачынанню конкурсы на беларускую песню і конкурсы тэатральных калектываў. Апошняе пасяджэнне Прэзідыума ГП БГКТ (адбылося 13.VII.) дало ацэнку гэтым конкурсам. Сёлета конкурс на беларускую песню і агляд тэатральных калектываў найлепш былі арганізаваны ў Гайнаўскім павеце. Добра праведзены былі конкурсы таксама ў беластоцкім і сямяціцкім аддзелах. У конкурсах на беларускую песню прыняло ўдзел ва ўсіх аддзелах БГКТ 158 чалавек, а ў тэатральных аглядах — 15 калектываў.

Сярод школьнай моладзі ў конкурсе на беларускую песню прыняло ўдзел 112 вучняў, а ў тэатральным аглядзе таксама 15 калектываў. Гэтыя конкурсы на найвышэйшым арганізацыйным узроўні праведзены былі ў Бельскім і Гайнаўскім паветах.

На гэтым пасяджэнні Прэзідыума былі зацверджаны таксама план працы ГП на другое паўгоддзе 1973 года і прынята праграма ўдзелу БГКТ у ваяводскіх конкурсах „Беластоцкая вёска — гаспадарная і культурная" і „Жыхары свайму гораду".

■ На ўрачыстай сесіі павятовай рады нарадовай у Бельску 20 ліпеня з нагоды свята Адраджэння выступілі з канцэртамі бельскі хор БГКТ і эстрадная група з Плёсак.

■ Для ўдзельнікаў сесіі гміннай рады нарадовай у Орлі даў канцэрт харавы калектыў БГКТ з Дубяжына.

■ У Нараўцы 20 ліпеня ўдзельнікі ўрачыстага гміннага пасяджэння аглядалі беларускі савецкі фільм пад загалоўкам: „Гадзіннік спыніўся апоўначы", які дэманстраваўся працаўнікам і апаратурай ГП БГКТ.

■ Да аднаго з галоўных абавязкаў члена БГКТ належыць рэгулярнае аплочванне членскіх складчын. У Бельскім павеце ў гэтай справе найбольш добрых слоў можна сказаць аб гуртку БГКТ у вёсцы Аўгустова, дзе старшынёй гуртка з'яўляецца Яўгень Аніська. Там усе члены гуртка аплочваюць членскія складчыны на пачатку года. (мх)


ПРАЗ ТЫДЗЕНЬ У „НІВЕ"



Харавы калектыў з Белавежы на фэстыне ў Збучы. Аб фэстыне чытай на стар. 5.

Фота М. Хмялеўскага

Падзеі ◇ Здарэнні ◇ Факты ◇ Каментарыі ◇ Весткі



СВЕТ

ЮБІЛЕЙНЫ ФЕСТЫВАЛЬ

Дваццаць тысяч дзяўчат і хлопцаў з больш чым 140 краін прымае ўдзел у X Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Берліне. Па сваёй шырыні і прадстаўніцтву ён перасягнуў усе папярэднія фестывалі.

Аб папулярнасці і значэнні X фестывалю сведчыць і тое, што на ім акрэдытавана рэкордная колькасць журналістаў. Заяўкі на акрэдытацыю прыслалі і тыя краіны, якія раней ніколі гэтага не рабілі.

Ніводзін з ранейшых фестываляў не праводзіўся ў такой спрыяльнай абстаноўцы. У міжнародных адносінах намецілася яўная тэндэнцыя да разрадкі напружанасці, да супрацоўніцтва, што можа прывесці да трывалага, працяглага міру. Пераход ад „халоднай вайны" да адносін міру, узаемнай павагі, да супрацоўніцтва паміж дзяржавамі розных сацыяльных сістэм знаходзіць адлюстраванне ў маладзёжным руху.

У Берліне намечана абмеркаваць практычна ўсе праблемы сучаснай міжнароднай палітыкі. Колькасць плануемых палітычных мерапрыемстваў — больш за 500. Асаблівасць гэтага фестывалю заключаецца ў тым, што ён не абмяжоўваецца рамкамі праграмы.

На берлінскім фестывалі апынуліся прадстаўнікі ад 1700 маладзёжных арганізацый свету, 0,5 мільёна турыстаў з іншых краін, а ўвогуле адбылося 1500 мерапрыемстваў.

З НАГОДЫ СВЯТА

20 гадоў таму назад штурм казарм Манкада абвясціў канец праімперыялістычнай дыктатуры на Кубе.

Напярэдадні свята працоўныя Кубы атрымалі ключы ад 13 тысяч добраўпарадкаваных кватэр, пабудаваных сіламі брыгад-добраахвотнікаў.

Звыш 6.700 гектараў урадлівых зямель адваявана ў хмызнякоў, пры чым работа была закончана на два месяцы раней тэрміну.

НОВАЯ МАЛАДЗЁЖНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ

24 ліпеня ў Каіры абвешчана стварэнне новай маладзёжнай арганізацыі — Арабскага сацыялістычнага саюза Егіпта. Аб гэтым аб'явіў прэзідэнт АРЕ Анвар Садат, які выступіў на масавым мітынгу прадстаўнікоў егіпецкай моладзі, што адбыўся ў Каірскім універсітэце.

НЯШЧАСНЫЯ ВЫПАДКІ

У мінулым годзе ў Японіі зарэгістравана 1.400 тысяч няшчасных выпадкаў на вытворчасці, у тым ліку 5.600 са смяротным зыходам. Прычым 77 прац. няшчасных выпадкаў мелі месца на сярэдніх і невялікіх прадпрыемствах, на якіх занята менш ста чалавек.

МАЙСТЭРНЯ ФАЛЬШЫВЫХ ГРОШАЙ

Паводле заявы Скотланд-Ярда, у Англіі выяўлена „адна з буйнейшых у Заходняй Еўропе майстэрань па вырабу фальшывых грошай". Англійская паліцыя захапіла некалькі дзесяткаў скрынак з фальшывымі фунтамі стэрлінгаў, французскімі франкамі, амерыканскімі і аўстралійскімі доларамі на агульную суму 10 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў.

(ак)



БССР

ПЛАН ПЕРАВЫКАНАНЫ

Цэнтральнае статыстычнае ўпраўленне БССР паведамляе, што план першага паўгоддзя 1973 года па рэалізацыі прамысловай прадукцыі выкананы на 102,7 прац. Перавыкананы план выпуску большасці важнейшых відаў вырабаў. У параўнанні з першым паўгоддзем мінулага года аб'ём прамысловай вытворчасці павялічыўся на 9,9 прац., прадукцыйнасць працы ўзрасла на 7,1 прац.

ПАМЯЦІ У. МАЯКОЎСКАГА

Беларускі савецкі друк шырока адзначыў 80-ую гадавіну з дня нараджэння выдатнага трыбуна рэвалюцыі Уладзіміра Маякоўскага. Пімен Панчанка на старонках „Літаратуры і Мастацтва" піша, што „...Маякоўскі сустракаўся з працоўнымі Беларусі, моладдзю, беларускімі пісьменнікамі, быў госцем Старшыні Савета Народных Камісараў Язэпа Адамовіча. Паэт радаваўся росквіту савецкіх рэспублік і брацкіх літаратур. У 1927 годзе Маякоўскі быў у Варшаве па запрашэнню мясцовага ПЭН-клуба. З ім гутарыў рэдактар часопіса „Польска вольносць". Паэт расказваў пра літаратараў Расіі, Грузіі, Украіны. „З беларусаў хачу звярнуць вашу ўвагу на Коласа", — заявіў тады Маякоўскі.

НА РАДЗІМЕ МІЦКЕВІЧА

Група беларускага аддзялення Брэсцкага педінстытута імя А. Пушкіна пабывала на экскурсіі па маршруту: Брэст — Навагрудак — Стаўбцы — Мінск — Вільнюс — Гродна — Брэст. Праязджачы па радзіме А. Міцкевіча, студэнты наведалі музей паэта ў Навагрудку, пабывалі на кургане, які быў насыпаны ў памяць аб ім. У Смольне на Стаўбцоўшчыне сустрэліся з братам Я. Коласа — Язэпам, у Мінску наведалі музей Я. Купалы і Я. Коласа, у Гродна глядзелі домік Элізы Ажэшкі, а ў Вільнюсе хадзілі тымі вуліцамі, дзе калісьці вучыўся Ф. Багушэвіч.

ПОМНІК БАГДАНОВІЧУ

Халопеніцкая сярэдняя школа Крупскага раёна носіць імя класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча. Вучні школы рашылі ўстанавіць помнік любімаму паэту. Яны доўга і шчыра працавалі, каб сабраць патрэбную суму грошай. І вось нядаўна ў Халопеніцкай школе ва ўрачыстай абстаноўцы быў адкрыты бюст бессмяротнаму песняру.

НОВЫЯ МУЗЕІ

Загадам міністра культуры БССР вырашана адкрыць новыя краязнаўчыя музеі ў раённым цэнтры Капыль і ў вёсцы Дукора Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці. Экспанаты ў Капыльскі музей жыхары горада збіралі на працягу 4 год. Накапілася іх больш за тысячу. Адлюстроўваюць яны перш за ўсё падзеі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

У Дукорскім музеі налічваецца ўжо каля 5 тыс. экспанатаў. Гэтая вёска існуе звыш 200 гадоў. Пісьмовае ўпамінанне аб ёй датуецца 1767 годам. З Дукоры выйшла многа слаўных людзей, а жыхары гэтай вёскі адзначыліся ў змаганні за савецкую ўладу пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі і ў партызанскай барацьбе з фашыстамі. (вр)



ПОЛЬШЧА

ДЭЛЕГАЦЫЯ ДРВ У ПОЛЬШЧЫ

З візітам дружбы прыехала ў нашу краіну дэлегацыя ДРВ на чале з прэм'ерам Фам Ван Донгам. Размовы вяліся з польскімі палітычнымі правадырамі. Дэлегацыя наведала Шлёнск і кракаўскую зямлю, між іншым Закапанэ і Паронін. Пасля звароту ў Варшаву, Фам Ван Донг сустрэўся з 300-асабовай групай в'етнамскай моладзі, якая вучыцца ў польскіх вышэйшых школах. Потым дэлегацыя ДРВ у суправаджэнні прэм'ера П. Ярашэвіча наведала Прушкаў пад Варшавай, дзе на чыгуначным прадпрыемстве адбыўся мітынг дружбы. З прамовамі выступілі Пётр Ярашэвіч і Фам Ван Донг.

У выніку размоў паміж дэлегацыяй ДРВ і ўладамі ПНР быў падпісан дакумент аб гаспадарчым і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве паміж абедзвюма краінамі. На заканчэнне візіту апублікавана супольная заява.

70-АЯ ГАДАВІНА II З'ЕЗДУ РСДРП

70 год мінула ад часу, калі на II з'ездзе Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі ў Бруселі ў 1903 годзе Ленін сфармулаваў бальшавіцкую праграму працы і барацьбы. Быў гэта пералом у рускай сацыял-дэмакратыі, якая сваёй дзейнасцю распасціралася ў той час на польскія землі.

З выпадку гадавіны ў краіне адбываліся мерапрыемствы, якія адзначалі гэты факт. У Варшаве сабралася група ветэранаў рабочага руху. З іх удзелам адбылася сустрэча ў будынку Сейма, на якой са словам выступіў Ф. Шляхціц — член Палітбюро і сакратар ЦК ПАРП. У варшаўскім Музеі Леніна была адкрыта выстаўка, якая ілюструе ролю і значэнне II з'езду РСДРП і нараджэнне новай пралетарскай праграмы палітычнай барацьбы.

ПАСЯДЖЭННЕ ПАЛІТБЮРО ЦК

На чарговым пасяджэнні Палітбюро ЦК займалася праблемамі, якія выцякаюць з II кангрэсу польскай навукі. Палітбюро сцвердзіла, што вынікі навуковых доследаў трэба ўсё шырэй прымяняць на практыцы.

ПОЛЬСКАЕ ВІНШАВАННЕ ДЛЯ КУБЫ

У сувязі з 20-ай гадавінай кубінскай рэвалюцыі — адначасова нацыянальнага свята Кубы — партыйна-палітычнае кіраўніцтва ПНР выслала ўладам і насельніцтву Кубы віншавальную тэлеграму.

Э. ГЕРЭК У ПЛОНСКІМ ПАВЕЦЕ НА МАЗОЎШЫ

I сакратар ЦК ПАРП Э. Герэк наведаў Плонскі павет у Варшаўскім ваяводстве, дзе пазнаёміўся са станам жніўных прац. Наведаў таксама новы, найбольшы ў краіне халадзільнік сельскагаспадарчых пладоў „Гартэнкс" у Плонску.

КАНІКУЛЫ 1973

З розных форм арганізаванага адпачынку для дзяцей і школьнай моладзі скарыстаецца гэтым летам 2.133.000 асоб.

ГМІННЫЯ ШКОЛЫ

Першыя гмінныя школы ўзніклі год таму назад. Было іх тады толькі 12. У верасні гэтага года распачне працу 700 гмінных школ. (вл)



ВАЯВОДСТВА

ЖНІВО

У многіх гаспадарках ужо заканчваецца кашэнне жыта. Пачаўся збор яравых. Частыя дажджы вельмі перашкаджаюць у звозцы жыта з поля. Выкарыстоўваецца кожная хвіліна добрага надвор'я. Вялікую дапамогу старым і адзінокім людзям аказвае вясковая моладзь — гурткі БГКТ, ЗСМВ і гарцэры. Лозунг, кінуты, як штогод, ЗСМВ — „Кожны колас на вагу золата", падхоплены ўсей моладдзю, якая прабывае ў час жніва на вёсцы.

ТАВ. Е. ЛУКАШЭВІЧ НА БЕЛАСТОЧЧЫНЕ

26 ліпеня на Беласточчыне прабываў сакратар ЦК ПАРП тав. Е. Лукашэвіч. Госць цікавіўся ходам жніўнай кампаніі ў нашым ваяводстве, а таксама падрыхтоўкай да Цэнтральных дажынак. Разам з I сакратаром ВК ПАРП тав. З. Куроўскім Е. Лукашэвіч пабываў на пляцы будовы сельскагаспадарчай выстаўкі.

НОВЫ КАМУНІКАЦЫЙНЫ ВУЗЕЛ

28 ліпеня адбылася ўрачыстая афіцыяльная перадача новага камунікацыйнага вузла на скрыжаванні вуліц Звыцэнства, Гетманскай і Гагарына ў Беластоку. Новы вузел знаходзіцца на важным камунікацыйным шляху Е-12, які перасякае Беласток з захаду на ўсход. Новае вырашэнне і тэхнічнае выкананне вузла значна паправіла бяспеку руху на гэтым скрыжаванні і з'яўляецца новым прыгожым і сучасным элементам у выглядзе нашага горада.

З ПАВЕДАМЛЕННЯ ВУС

Ваяводскае статыстычнае ўпраўленне (ВУС) апублікавала інфармацыю аб выкананні плана развіцця гаспадаркі ваяводства за I паўгоддзе 1973 года. У сельскай гаспадарцы ў мінулым паўгоддзі наступіў узрост агульнай плошчы пад пасевамі на 1,2 прац. коштам загаспадарання адлогаў. Павялічылася плошча, занятая цукровымі буракамі, бульбай, рапсавымі і агароднінай. Зменшылася плошча пад пасевамі збожжавых культур. У параўнанні да мінулага года павялічылася пагалоўе быдла на 7,5%, а свіней — на 22,7%. Скупка жывёлы на ўбой узрасла за гэты перыяд на 11,6%. На 11% павялічыліся дастаўкі малака.

У прамысловасці таксама зазначыўся дынамічны ўзрост прадукцыі. У параўнанні да першага паўгоддзя мінулага года вартасць глабальнай прадукцыі ўзрасла на 14,3%. Найвышэйшая дынаміка ўзросту прадукцыі наглядалася ў прамысловасці будаўнічых матэрыялаў (34,4%), машыннай (20,7%), дрэваапрацоўчай (17,1%) і харчовай (13,3%) прамысловасцях. Колькасць рабочых узрасла за той час на 8,7%.

ВЫСТАЎКІ

Акруговы музей у Беластоку запрашае ўсіх наведваць галерэю польскага мастацтва і выстаўку разьбы мастака А. Карнага. Музей і выстаўка знаходзяцца ў гарадской ратушы.

Ад 24 ліпеня ў салоне Саюза мастакоў на Рынку Касцюшкі адкрыта выстаўка мастацкага шкла ў выкананні Ю. Гаўліка. (яч)



Niedziela 5.VIII.

7.30 Program dnia. 7.35 TV Technikum Rolnicze: „Orka i siew rzepaku". 8.15 „Przypominamy, radzimy". 8.35 „Nowoczesność w domu i zagrodzie". 9.00 „Świat, który nie może zaginąć" — film dok. ang. 9.25 „W starym kinie" — Wczesne komedie Chaplina — cz. III. 10.10 X Światowy Festiwal Młodzieży i Studentów w Berlinie — Parada przebojów krajów socjalistycznych. 11.10 Niedzielny koncert promenadowy z Berlina. 12.10 Dziennik. 12.25 „Przemiany". 12.55 PKF. 13.05 Teatrzyk dla Przedszkolaków: M. Terlikowska — „Awantura o tamę". 13.50 „Wielkie wyprawy" („Pokochać wiatr") cz. I. 14.20 Losowanie Totolotka. 14.35 „Trapez" — film baletowy TV ZSRR. 15.00 „Piórkiem i węglem". 15.25 „W letnim nastroju" — program rozr. TV Litewskiej. 15.55 „Przyjąć czy odrzucić" — rep. 16.55 Sprawozdanie z półfinału zawodów lekkoatletycznych mężczyzn o Puchar Europy. 18.55 „Kryteria". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 „Sopot w wiosennej szacie". 21.10 „Własny domek" — film fab. ang. 22.00 Magazyn sportowy. Sprawozdanie z finału kontynentalnych indywidualnych Mistrzostw Świata na żużlu. 23.00 Sprawozdanie z uroczystości zamknięcia X Światowego Festiwalu Młodzieży i Studentów w Berlinie.

Poniedziałek 6.VIII.

16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Letnie rozrywki" („Profile kultury") 17.00 Gra Orkiestra Radia i TV Ukraińskiej. 17.35 „Echo stadionu". 18.05 TV Kurier Olsztyński. 18.20 „Oferty". 18.30 TV Kurier Warszawski. 18.50 „Eureka". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 Letni Przegląd Teatru TV: K. H. Roztworowski — „Niespodzianka". 21.40 Program publicystyczny. 22.10 Dziennik. 22.25 TV Studio Muzyki Rozrywkowej.

Wtorek 7.VIII.

10.00 „Własny domek" — film fab. ang. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Film muzyczny TVP: „Maurice Bejart — człowiek XX wieku". 17.10 „Rybacy z Mierzeji" ("Morskie spotkania"). 17.40 TV Kurier Mazowiecki. 18.00 TELEFERIE. 19.10 „Przypominamy, radzimy". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 FILMOTEKA ARCYDZIEŁ: „Siedmiu samurajów" — film fab. jap. 22.55 Dziennik.

Środa 8.VIII.

9.00 FILMOTEKA ARCYDZIEŁ: „Siedmiu samurajów" — film fab. jap. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Lato nad Szprewą" — film dok. NRD. 16.55 „Informacje, Towary, Propozycje". 17.15 „Turystyka i wypoczynek". 17.50 „Sylwetki X Muzy" — Stanisław Zaczyk. 18.20 TV Kurier Warszawski. 18.40 „Dialogi historyczne". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 „Ludzie z Muddy Creek" — film („Bonanza"). 21.05 „Świat i Polska". 21.50 „Artyści, których podziwiamy" — Jerzy Lefeld. 22.40 Dziennik. Wiadomości sportowe.

Czwartek 9.VIII.

10.00 „Ludzie z Muddy Creek" — film („Bonanza"). 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „W Obrytem i gdzie indziej" — rep. film. 17.10 „Na Orawie". 17.45 TV Kurier Mazowiecki. 18.05 TELEWIZJA MŁODYCH. 18.50 „Kwadrans akademicki". 19.15 „Przypominamy, radzimy". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 Teatr Sensacji: J.B. Priestley — „Zaciemnienie w Gretley". 21.35 PKF. 21.45 „Refleksje". 22.15 „Ekspres nr. 32". 22.45 Dziennik. Wiadomości sportowe.

Piątek 10.VIII.

10.00 „W upojnym rytmie tanga" — film fab. rum. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Nie tylko dla pań". 17.10 „Sztuka niemiecka około roku 1500" — program oświatowy. 17.40 TV Kurier Warszawski. 18.00 TELEFERIE. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 „Podwójna margaretka" — program rozr. bułg. 20.55 „Panorama". 21.35 Teatr TV na świecie: A. N. Ostrowski — „I koń się potknie" cz. I (spektakl [illegible] Radzeckiej). 22.50 Dziennik. Wiadomości sportowe.

Sobota 11.VIII.

10.00 „Francja naprzód" — film fab. franc. 16.00 Program dnia. 16.05 Program I proponuje. 16.30 Dziennik. 16.40 „Teraz i w każdą godzinę" — film TVP. 17.30 „Spotkania z przyrodą". 18.00 „Przed Uniwersjadą w Moskwie" — program sportowy. 18.30 „Pegaz". 19.20 Dobranoc. 19.30 Monitor. 20.15 „Francja, naprzód" — film fab. franc. 21.45 Wiadomości sportowe. Kronika Mistrzostw Polski w lekkiej atletyce. 22.15 „Utwory dla moich przyjaciół". 22.55 Dziennik. 23.10 „Rendez vous nad Renem" — program rozr. TV NRF.



Piątek, 3 sierpnia

7.45 Film fab. 8.45 W eterze „Młodość". 9.45 Koncert. 10.15 Szkoła szachowa. 10.45 Filmy dokument. 12.55 Program dnia. 13.00 Film seryjny. 16.00 Piłka nożna. „Dynamo" (Berlin) — „Dynamo" (Moskwa). 17.45 Spektakl TV. 19.00 Czas. 19.30 Festiwal w Berlinie.

Sobota, 4 sierpnia

7.00 Program dnia. 7.25 Film seryjny. 9.30 Przegląd międzynarodowy. 10.15 Filmy animowane. 11.10 Film fab. 13.40 W świecie zwierząt. 16.10 Koncert zespołów amatorskich. 17.20 Festiwal w Berlinie. 19.00 Czas. 19.30 Panorama filmowa. 21.00 Festiwal w Berlinie.

Niedziela, 5 sierpnia

7.00 Program dnia. 7.30 Film seryjny. 9.45 Filmy animowane. 10.10 Spotkania muzyczne. 11.15 Film fab. dla dzieci. 12.40 Ekran i czas. 13.40 Koncert. 14.10 Ziemia i ludzie. 15.00 Piłka nożna. ZSRR — Szwecja. 18.00 Klub filmowy. 19.00 Czas. 19.30 Koncert. 20.55 Festiwal w Berlinie.

БЕЛАВЕЖА

ОРГАН ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАГА АБ'ЯДНАННЯ ПРЫ ГП БГКТ № 175

* * *

Дарога да цябе — нялёгкая дарога
прашу я Дарвіна
зьмяні мяне у абяз'яну
майму каханню хтось падставіў ногу
і дрэва майго шчасця ў сэрца раніў
бяда у тым што ўсё я разумею
мне лепш было б
тупым і безразумным
каб востры вецер
твар тупы абвеяў
мне дзікаму дурному гуиу
табе дзяўчына
дзякую за боль мой
ён дарагі мне так як боль і радасць
ты вольная
і я таксама вольны
на брак кахання няма рады

Алесь Барскі



Праз Гаркавічы

Пакалечаны гасцінец. Мы зыйшлі на сцежку і пасталі. Першым спыніўся я, сын яшчэ ішоў.

Здалося, што мяне клічуць...

Мы прайшлі ля доўгага плоту пад старымі вішнямі, у якіх kралі падлеткі. Яны прытаіліся, і я пачаў з сынам гутарку аб чымсьці непатрэбным. Забаяўся, што ён, прачнуўшыся са сваіх думак, убачыць зладзеяў! Прайшлі ля надта доўгага плоту, і з навюсенькіх штыхет. Перад намі кульгаў гасцінец: да Юраўлянаў пяць кіламетраў.

Кліча яе голас...

Мне зрабілася брыдка, і я не прыдумаў нічога лепшага ад таго, што мы вельмі спяшаемся... Але яна, пасярэдзіне далёкага панадворка і павернутая да загумення, гаманіла з дзіцём. Выпусціла з рук і, прытвараючыся страшыдлам, бегла за ім. Яно сакатала. І абое пападалі, і зноў пабеглі.

Аж засланілі іх вішні.


Мяне пацягнула назад, у Гаркавічы. Убачыўшы гэта, малыя выраіліся з вішняў на дарогу і ўцяклі ў загоны канопляў ды маку.

Сын голасна засмяяўся; я падышоў да яго, і мы рушылі ў Юраўляны. Ішоў я крокам чалавека, якому не дазволена зрабіць нешта такое, чаго потым шкадаваў бы. Хаця доўга адчуваў на плячах яе позірк, вочы, якія пазнавалі... У раптоўнай цішыні.

У Юраўлянах напіліся з крыніцы. Заначавалі ў Крынках, каб досвіткам выехаць дадому, у Беласток.

Неба ў тую ноч мела васемнаццаць гадоў, чыстае і зорнае.

Сакрат Яновіч



Агонь

Задрыжэў Зеўс грамаўладны
Няўвага ўкрала яму панаванне
Праметэй шчасце даўшы людзям
Не чуў балючых шпонаў арлiных

Хто падзяліўся
Чырвоным жарам
Глядзеў на сонца і тварыў песню
Можа было яно богам сусвету
Чалавек меў святы агонь.

Вякі гарэлі слабым надзеяй
Вякі гарэлі багатым згубай
Зарыва часу
Кроў за кроў
А смерць за смерць брата

На зямлю з папялішчаў
Уставалі новыя людзі
З сэрцам у голуба крыллях
І кожны глядзеў у неба
Дзе вечны гарэў агонь

Ул. Гайдук

Спеў салаўя

А сёння
над ранкам
птушкі мяне разбудзілі
салавей
сваім спевам
серабрыстым
усё
перадаў
і шум лясоў
і спёку поля
і смех дзяцьці
і пах кветак
блакітнае неба
спяваў
так прыгожа
так чыста
як бы
гэта
Шапэн
сеў і паклаў
рукі на клавішы

Ірэна Баравік

* * *


Сніўся сон мне. Коні, коні,
Стук капыт, дзе не круні.
Палавецкая пагоня
І яцвягаў скакуны.

Сцены, сцены Белавежа!
Але й рогат за спіной:
— Не замкнёны твае межы,
Не смяшы, яцвяг, ты — мой!

І над соннаю Лутоўняй,
У надрэчных паплавах,
Мах — тапорык латуневы,
І панік ў траву яцвяг.

Залатыя нашы гоні,
Таму, як узыдзе рунь,
Сняцца ўздыбленыя коні
І крывавая латунь.

Юрка Зубрыцкі



На бельскай гаворцы



Ліпцёвы віетёр закінув пуколь волуос на твар. Муоцно прыгравало пэрэдполуднёвэ слонце і подых того наднаровского свавуольніка прынюос трохі прохлады. Откідаючы з твару забруджаною рукою волосы, Вона зобачыла, як далеко, далеко на горызонті мэрэшчутсе в роспалянум воздусі шары дахуовкі боярськіх домуов.

Чэрэз прытэмнёны окуляры зобачыла таксамо, як досыць шпарко полевою стэжкою прыбліжаетсе хтось на ровэры. Вжэ хотіела знов прынятісе за боротьбу з зіелём, которэ в сіетум році так нахабно заатаковало огуркі, як заміетіла, што ровэрыст як бы затрымовуется коло Еі. Кінувшы ровэр на загуон, пэрэгінаючысе над торбою, помалу подыходів лістонош. Сэрце затрэпоталосе — чыж бы вжэ напісав? Але — што ж то! Заміест знакомого біелого конвэрта, разом со словамі „Помагай Буог", гуость протягнув руку з нэвэлічкім папіерцём. Божэ! Тэлеграма! Што сталосе? — пыталісе Еі очы, біегаючы з папіерця на гостя, то знов на папіерэць. Але спокуойны твар лістоноша як бы говорыв — тіхэнько, тіхэнько, нічого кепського тут нэма.

Оптэршы рукі об джынсы, помаленьку одорвала наклейку... „Другого ліпця ждэм в Городкові, в школі. З прывіетом, Павол".

— Туолько подпіс, — проговорыв лістонош, але Вона як бы нэ чула. Хутко чэркнула на пудсунутым папіерцёві і далі стояла нэрухома...

...нізко над рыкою
сама буду полівaті
друобною слёзою...

...Так, так — піесня. Мнуого пісэнь, мнуого жартов, мнуого дружбы і роботы... мнуого, але як жэш мало рувняючы з сіетымі дэсэтьмі сотымі. Так, сэстра на колёніях, але еслі б і дома была, то што з еі за робуотніця. Той малыш буольш знішчыт як уратуе. А Мама сама? Што ж і Вона дасть рады з сіетымі загонамі. А за пару днюов будэ пуозно... зрэштою, на кого ж вона саділа тые огуркі...

...сама буду полівaті
друобною слёзою...

— знов як бы вжэ дэсь з оддалі почулісе слова піесні з дітячых годуов.

*

Огромна зала Інстытута. Вжэ зобраласе кадра. О! Выставка! Ну, цікаво, што ж там е. Ага! Кроніка: „...дісь знов Опекун сказав на добры дэнь дівчатам — котікі, вы гожэ дісь выглядаетэ, але я шчэ вэрнусь до сіетоі тэмы..." О! А тут: „...а дзісь пуд сам вэчур Вася і Лена, в которы то вжэ раз!!! заблудзілісе в пулгэктаровум ліесі...". А што тут? „...кругом Зубкуов направду сэрдэчны людэ; іх слова, іх песні грыэют нашы сэрця... нэ знаем, чы туолько нашы сэрця, чы тожэ сыпучы пісок поміж засохшым вэрэсом, на которум ставім своіе босы ногі...".

А фотографіі? Можэ?... Ніе! Нэ быть!

Тут прыстанок..., тут бэрэзіна..., далі домы пуд шарою дахуовкою..., стэжка..., лістонош...

Ніе! Нэма лістоноша! Туолько огуркі... Дэсэть сотых огуркуов!

Мікола Врублеўскі

* * *

Не дажыўшы канца
Дзень
Абарваўся
на захадзе
Праменнем быту апошнім
Асвяціў
радасць свайго існавання
Заззяў чырваннио гнілой
І адкаціўся
ў нябыт
Захапіўся краінаю чараў
Вечнасцю доўга ідучай

Юрка Харкевіч

Вясна

выбітыя словы
праз лета зімы
і гады


заzелянелыя птушкі
лісцем расшабётаныя

прадуцца ніткі маёвыя
клубарыб'е — грыбалоўства

сенакосы
рана росы жамчыны
шэх-эрэзада — пеўня спяванне

адляцець атэстатабраннем
прывітаць у Атаміцах
ліпы Яна

З. Сачко



ЭКЗАМЕН НА „ВЫДАТНА"

Пачатак на стар. 1

пабудавалі, накрылі — усё гэта зрабіла моладзь з ЗСМВ. Транспартам дапамагло прадпрыемства па здабыццю крэйды, на матэрыялы гміна дала 15 тысяч злотых, а Прэзідыум ПРН у Сямяцічах даклаў 10 тысяч злотых. Аб'ект жа паўстаў вартасцю якіх 120—150 тысяч злотых. Але на гэтым не канец. Маем крыху матэрыялу. Пабудуем з яго 2 кэмпінгавыя домікі. Потым пастараемся пабудаваць летняе кафэ. У ангары ўжо стаіць 12 байдарак, а будзе іх 30. Словам, Мельнік будзе мець неўзабаве цэлы комплекс для прыемнага адпачынку над вадою. Просім у госці!..

Але ў голасе начальніка я пачуў і нотку змучанасці. І не дзіва. Як кажуць мельнічане, ён штодня ад шостай гадзіны раніцы і да адзінаццай уночы ўвесь час на нагах. Праца з моладдзю — гэта толькі маленькая частачка яго шматграннай дзейнасці ў гміне.

Калі я ад'язджаў з Мельніка, у Тапаліне ўжо суцішыліся малаткі ды пілы, бліснула электрычнае святло — гэта маладыя электрыкі правяралі асвятленне на заўтрашнюю ўрачыстасць, якая напэўна працягнецца далёка за поўнач.

На другі дзень я даведаўся, што 1 ліпеня г.г. павятовы злёт у Мельніку прайшоў удана. Значыць, мельніцкая моладзь свой уступны экзамен на карысную дзейнасць для сябе і свайго асяроддзя здала на „выдатна".

Мікалай Гайдук
фота аўтара

Што такое „інсемінацыя" — сялянам ужо няма патрэбы тлумачыць, бо аб апладненні кароў усе яны прынамсі чулі. Штучным яно называецца толькі ўмоўна. У сапраўднасці ў выпадку інсемінацыі няма нічога штучнага, а проста гэта толькі іншы метад данясення натуральнага насення ў арганізм каровы.

А ўсё ж калі ў вёсцы распачаць гутарку пра інсемінацыю, зараз жа можна пачуць шматзначнае хіхіканне і пабачыць на вуснах вядомую ўсмешку. Адважнейшыя гаспадары раскажуць вам яшчэ некалькі анекдотаў. Адзін з іх можа быць больш-менш такога зместу: па запрашэнню селяніна прыімчаўся на матацыкле інсемінатар, расклаў свае прылады і рыхтуецца да інсемінацыйнай працэдуры. За ім уважна назірае гаспадыня. „Нейкі маленькі, мізэрны", — крытычна ацаніла яна інсемінатара і хуценька пабегла дахаты. Праз хвіліну вярнулася яна, трымаючы ў руках кухонны табурэт. „Ужо па справе", — сказаў інсемінатар. „Так хутка?! — здзівілася цётка. — А я ж вам столачак прынесла".

Смяяцца няма чаго. І не для смеху паўтарыў я гэты тыповы анекдот. Ён



вельмі добра ілюструе стан свядомасці значнай часткі нашага сялянства. Ад прадзедаў закаранелую традыцыю цяжка перамагчы на працягу дзесяці гадоў, бо столькі часу прайшло ад той пары, калі на Беласточчыне ў шырэйшым маштабе пачалі гаварыць пра інсемінацыю і гэтым метадам апладняць кароў. Цяпер усе кіраўнікі сельскай гаспадаркі згодны ў тым, што інсемінацыя — справа вельмі сур'ёзная, што без спраўнай сеткі інсемінацыйных пунктаў проста немагчыма інтэнсіўна развіваць жывёлагадоўлю, для якой у Беластоцкім ваяводстве існуюць вельмі спрыяльныя ўмовы, бо зялёныя ўгоддзі складаюць тут звыш 30 прац. плошчы ваяводства. Аднак колькасць рагатага статку ў пераліку на 100 га зямлі — самая нізкая ў краіне. Ды не справа ў колькасці. Дзве каровы нізіннай чорна-белай пароды — гэта зусім не тое, што дзве каровы чырвоныя. Гаспадары дасканала ведаюць аб гэтым і таму на ўсіх сходах патрабуюць ад улад, каб сельскагаспадарчая адміністрацыя хутчэй давала ім цялят і ялошак чорна-белай нізіннай пароды. Адкуль аднак іх браць? Карова — не свіння, па 10 цялят не водзіць. На размнажэнне новай пароды трэба часу. Яе чысціню можна захаваць толькі тады, калі па сялянскіх сялібах не будзе „дзікіх" кароўіх кавалераў. Трэба, каб усе сяляне ведалі, што без пісьмовага дазволу дзяржаўнай адміністрацыі нельга трымаць некайстраванага быка, што за гэта пагражае высокая кара. Знаходзяцца аднак адважныя, для якіх бык з'яўляецца дадатковай крыніцай даходу. Перш за ўсё выкарыстоўваюць яны недавер сялян да паспяховасці інсемінацыйнай працэдуры. Два гады таму назад здарылася, што жыхары вёскі Вілінава ў Сямяціцкім павеце напісалі калектыўную скаргу аж у Цэнтральны Камітэт партыі, каб закрыць інсемінацыйныя пункты ў Такарах і Верпалі, бо іх існаванне, даказвалі яны, давядзе да заняпаду жывёлагадоўлі ў гэтым раёне. Пасля праверкі аказалася, што сапраўды ў Вілінаве многа кароў заставалася незацеленымі, а працэнт паўтаральнасці інсемінацыйнай працэдуры быў шмат вышэйшы, чым у суседніх вёсках і двойчы перавышаў сярэдні ўзровень для ўсяго Сямяціцкага павету. Гэта пацвярджала б прэтэнзіі сялян. Спецыялісты па інсемінацыі пачалі тады шукаць прычыны. Мілейчыцкія ветэрынары 17 сакавіка мінулага года правялі ў Вілінаве ўсеагульны дакладны агляд кароў. Тады аказалася, што незацеленыя каровы або былі проста хворыя, або так замораныя, што ніякі цуд ім не памог бы. Дык справа не ў адмоўным уплыве інсемінацыі, а ва ўмеласцях гаспадароў. Сем вілінаўскіх красуль удалося ветэрынарам паспяхова вылечыць. Пры гэтай нагодзе выявілася, што спісаць скаргу падгаварыў сялян былы гадоўца быка.

Адзін такі сялянскі бык, як сцвярджаюць вопытныя спецыялісты, можа на працягу года апладніць не больш, чым 150 кароў. **Пры сістэме інсемінацыйнага абслугоўвання кароў дастаткова трымаць аднаго быка на 2.000 красуль.** Эканамічныя карысці відавочны тут, як на далоні. І таму перш за ўсё дзяржава ўсімі спосабамі падтрымоўвае штучнае апладненне кароў. Арганізацыяй інсемінацыйнай працэдуры займаецца Ваяводскае прадпрыемства ўнасянення жывёлы, якому падпарадкаваны раённыя прадпрыемствы. Адно з іх знаходзіцца ў Бельску. Там у выключна добрых умовах, пад пастаянным доглядам высокакваліфікаваных спецыялістаў гадуюць здаровых, чыстай пароды быкоў, ад якіх сістэматычна два разы ў тыдзень бяруць насенне і пасля рассылаюць яго ў замарожаным стане па ўсіх інсемінацыйных пунктах.

Асабліва добра працуюць інсемінатары ў Сямяціцкім, Лапскім, Высокамазавецкім, Замброўскім, Манецкім і Сакольскім паветах. Нядрэнна — у Бельскім, Беластоцкім, Аўгустоўскім і Алецкім. На жаль, у Гайнаўскім — слаба, хаця і тут здараюцца людзі, якія прыкладна выконваюць сваю прафесію. Вось, як Рыгор Фірс з Курашава, або Міхась Тарасюк з Чыжоў, або Яўген Смольскі з Лукі. Яны патрапілі пераканаць сялян, што штучнае апладненне лепш ім аплоціцца. І не толькі таму, што менш яно каштуе, бо гаспадар плоціць толькі 50 зл. ад каровы, а рэшту — 80 зл. — дакладае дзяржава. Без інсемінацыі няма што думаць аб развіцці жывёлагадоўлі. Дык таму на пытанне: **Да быка ці да інсемінатара?** — адказ можа быць адзін і рашучы: — **Толькі да інсемінатара!** Адначасова трэба патрабаваць, каб гэты чалавек сумленна выконваў сваю прафесію, за якую дзяржава плоціць яму даволі высокую пастаянную пенсію.

М. Нурэцкі

Пачатак на стар. 1

АДУКАЦЫЯ СТАНОВІЦЦА НЕАЦАНІМЫМ БАГАЦЦЕМ НАРОДА...

гэтых школ, можна заўважыць тут выразныя дыспрапорцыі, бадай, большыя, чым у іншых рэгіёнах краіны. Звязана гэта з тым, што школы працуюць у вельмі розных умовах, маюць рознае аснашчэнне, розныя памяшканні. Узровень падрыхтоўкі настаўнікаў таксама вельмі розны.

Трывожыць той факт, што існуе даволі многа школ з нізкай ступенню арганізацыі, у якіх найчасцей працуе пара настаўнікаў, не маючых усебаковай падрыхтоўкі. Думаю, што рэалізацыя канцэпцыі зборнай пачатковай школы прынесла б вялікія карысці, хоць непакоюся, што паявяцца з увядзеннем яе ў жыццё сур'ёзныя цяжкасці, большыя, чым у іншых рэгіёнах, звязаныя са слабым узроўнем дарог, а тым самым параўнальна слаба арганізаванай камунікацыяй, з вялікай адлегласцю паміж вёскамі.

Сур'ёзнай праблемай, вымагаючай хуткага вырашэння, з'яўляецца тое, што шмат дзяцей з пачатковай школы перарывае навуку. Думаю, што гэтай праблемы нельга вырашыць без некаторых змен у адносінах часткі бацькоў да школы і адукацыі. Трэба, зразумела, падкрэсліць, што ў апошніх дзесяцігоддзях наступілі тут карысныя змены, аднак у актуальнай сітуацыі школа, а таксама іншыя ўстановы, у асноўным сродкі масавага пераказу, павінны правесці каардынаванае дзеянне з мэтай давядзення да мінімума гэтай з'явы.

— Набліжаемся да канца гутаркі. Ці не маглі б Вы сказаць яшчэ, што з'яўляецца Вашай самай скрытай марай у даны момант?

— Найбольш, бадай, жадаў бы дасягнуць такога апанавання варштату навуковай працы, якое дазваляла б мне пісаць за суткі дзесятую долю таго, што пісаў... Онорэ дэ Бальзак на працягу адной ночы. Такім чынам можа ўдалося б мне хоць адзін раз датрымаць тэрмін у выдавецтвах.

— Сардэчна гэтага Вам жадаю!

Гутарыў **Мікалай С. Врублеўскі**



Нашаніўская пара

ЯДВІГІН Ш. — ЧАСТКА III

Закончыўшы пачатковую адукацыю ў доме Дуніна-Марцінкевіча, Ядвігін Ш. не ўмеў па сутнасці нічога. Трэба было прадаўжаць адукацыю. Ядвігін Ш. пастанавіў паступіць у гімназію. У якую? Напрыклад, заслужаны для беларускай літаратуры даследчык Дварчанін гаворыць, што Ядвігін Ш. паступіў у Віленскую гімназію. Іншыя даследчыкі пераканаўча даказваюць, што пісьменнік вучыўся не ў Віленскай, а толькі ў Мінскай гімназіі. Невядома таксама дакладна, ці гімназію ў Мінску закончыў, ці не. Крытык Ільяшэвіч гаворыць, што Мінскай гімназіі Ядвігін Ш. не закончыў. Мяркуюць, што вучыўся там ад 1881 да 1885 года. Быць можа, не прайшоў усяго гімназіяльнага курса і пачаў працаваць у аптэках Мінска або Радашковіч. У тыя часы можна было паступіць у вышэйшую медыцынскую установу, маючы чатыры класы гімназіі і некалькігадовую аптэкарскую практыку. Бадай, у 1887 годзе Ядвігін Ш. паехаў у Маскву і паступіў на медыцынскі факультэт Маскоўскага універсітэта. Не намерваўся вучыцца на лекара, а на аптэкарскага правізара.

Перыяд, у якім Ядвігін Ш. паявіўся ў Маскве, быў перыядам крызісу афіцыйных рускіх ідэалаў. Нарастаў апазіцыйны антыцарскі рух. Радыкальныя народніцкія настроі агарнулі шырокія колы студэнцкай моладзі. Як сябе павёў Ядвігін Ш.? Далучыўся да тых, хто лічыў, што Расіі неабходны шырокія рэформы. „Трапіўшы ў асяроддзе рэвалюцыйнай моладзі, — піша Голубева, — Ядвігін Ш. адразу стаў на бок тых, хто быў незадаволены існуючым ладам. Калі аднойчы ўспыхнуў бунт сярод студэнтаў Пятроўска-Разумоўскай сельскагаспадарчай акадэміі, універсітэцкія студэнты падтрымалі яго. Студэнцкія хваляванні хутка былі падаўлены, і ў ліку арыштаваных аказаўся студэнт-медык Антон Іванавіч Лявіцкі. Гэта здарылася 8 сакавіка 1890 г. (Л. Голубева, Ядвігін Ш. Гісторыя беларускай дакастрычнікай літаратуры, Мінск 1969, т. II, с. 466).

Так, яшчэ да арышту Ядвігін Ш. уступіў у Маскве ў нелегальную карпарацыю „Мінскае зямлячаства". Вось там на сходах і сустрэчах і выкоўваліся свабодалюбівыя ідэі і надзея на вызваленне бацькаўшчыны.

Дзейнасць зямлячаства не зводзілася да слоў і мараў. Яго члены, у тым ліку і Ядвігін Ш. уключыліся ў вялікія антыдзяржаўныя дэманстрацыі. Усё гэта і прывяло Ядвігіна Ш. і яго сяброў з Беларусі ў славутую маскоўскую турму Бутыркі. Прабыванне ў турме і Ядвігіну Ш. і яго сябрам памагло разабрацца ў многіх праблемах. Турэмны рэжым не належаў да крайне суровых. Сярод арыштаваных былі рускія, палякі, украінцы, грузіны. Арыштаваным дазвалялася арганізаваць нацыянальныя мерапрыемствы. У сваіх успамінах Ядвігін Ш. піша, што ў Бутырках быў арганізаваны канцэрт прадстаўнікамі паасобных нацыянальнасцей. Пасля канцэрта Ядвігін Ш. і яго беларускія сябры адчулі, што рускія, украінскія, грузінскія і польскія песні не ў стане ўздзейнічаць на іх-беларусаў так, як яны дзейнічалі на рускіх, украінцаў, грузін ці палякаў. Адсюль нарадзілася цвёрдая пастанова аб патрэбе развіваць сваю нацыянальную беларускую культуру і літаратуру. Арыштаваныя беларусы лічылі гэта справай неадкладнай. Пастанавілі яны ўняць у арганізацыйныя нормы сваю дзейнасць і прыцягнуць да яе як найбольшую колькасць студэнтаў-беларусаў. Першым практычным крокам у культурнай беларускай дзейнасці арыштаваных студэнтаў быў пераклад імі на беларускую мову апавядання рускага пісьменніка Гаршына „Сігнал".

Пасля выхаду з турмы Ядвігіну Ш. не ўдалося вярнуцца ў Маскоўскі універсітэт. Універсітэцкія ўлады непрыхільна глядзелі на тых студэнтаў, якія ўвайшлі ў канфлікт з існуючай сістэмай. Трэба было развітацца з марай аб прабыванні ў вышэйшай навуковай установе. Трэба было задаволіцца мінімальным. Ядвігін Ш. прайшоў практыку ў маскоўскіх аптэках, здаў экзамен і пастанавіў ехаць у Беларусь. Не быў у стане рэалізаваць свае навуковыя планы, пастанавіў ажыццяўляць нацыянальныя.

Як трэба ацаніць маскоўскі перыяд у жыцці Ядвігіна Ш.? Несумненна, станоўча. Сутыкненне з вялікімі студэнцкімі масамі, кантакт з рэвалюцыйна настроенай моладдзю, назіранне за развіццём нацыянальнай дзейнасці сярод студэнтаў — прадстаўнікоў розных народаў, урэшце стварэнне „Мінскага зямлячаства", — усё гэта мела грамаднае значэнне ў крышталізацыі нацыянальных і грамадскіх поглядаў Ядвігіна Ш. Мабыць там, у Маскве, Ядвігін Ш. канчаткова прыйшоў да вываду, што ён беларус. Факт гэты меў значны ўплыў на скіраванне Ядвігіна Ш. на пісьменніцкі шлях.

Хоць трэсні, а давай праграму

Хадуном захадзіў вядомы ўсім чытачам „Нівы" гарадоцкі харавы калектыў. Замітусіліся дзяўчаты. Абставіны прымусілі памаладзець яшчэ на некалькі гадоў і так бадзёрую Ніну Мушынскую — душу калектыву.

Справа ў тым, што дзяржаўнае прадпрыемства „Эстрада" запрасіла кабетак у славутую „Лясную оперу" ў Сопат на вялікі канцэрт рэгіянальных калектываў нацыянальных меншасцей. Выступаць маюць у пачатку жніўня. Бяда толькі, што паэтычна-музычная інсцэніроўка, з якой калектыў выступіў 15.VII.73 г. у Беластоку ў парку, „Эстрадзе" не падышла.

Прадпрыемства жадае адных песень ды танцаў. Вазьмі і апрацуй за некалькі дзён новую праграму! Вывучы новыя песні!

Двоіцца і троіцца дзяўчаты. Дзівы-дзівосныя творацца па ўстановах і прадпрыемствах. Спяваюць работніцы на трыкатажнай фабрыцы „Каро". Кажуць, што ад гэтага выразна ўзрасла прадукцыя кальсонаў. Здзіўлена паглядаюць хворыя на сімпатычную медсястру Раісу, якая ў такт вясёлай прыспеўкі, спрытна мяняе іголкі і, заглянуўшы хуценька ў картку са свежа вывучаным тэкстам, цэліцца шпрыцам куды трэба. А гэта, думаеце, усё. А што адзець? А што абуць? Прычоска свая, ці парык — гэта ж таксама пытанне. Прыгажэйшыя купальныя касцюмы даўно ўжо раскупілі. Трэба дзе-чым бліснуць на сапоцкай пляжы.

Адны дыстрыбутары заціраюць рукі. Перасталі да іх чапляцца за недахопы ў крамах. Увесь калектыў перайшоў на жорсткую дыету. Трэба ж у шырокім свеце паказаць зграбную гарадоцкую лінію.

Ларс



„Мікрафон для ўсіх". Выступаюць Беглюк Ірэна і Назарук Галіна з Гайнаўкі.



Гайнаўскі аддзел БГКТ пры дапамозе павятовых і гмінных улад і арганізацый 8-га ліпеня арганізаваў у лесе за Збучом фэстын, прысвечаны Дням Савецкай Беларусі ў Польшчы і XXX гадавіне Войска Польскага.

У лясочак, які завуць там „Грабняк", прыбыло многа людзей. Былі прадстаўнікі ўлад: I сакратар павятовага камітэта ПАРП у Гайнаўцы Людвік Бартосяк і сакратар па прапагандзе Мікалай Карпюк, кіраўнік аддзела культуры Ваяводскай рады нарадовай Антоні Гжэськевіч; прадстаўнікі ГП БГКТ: старшыня ГП Мікалай Самоцік, член Прэзідыума ГП Аляксандр Баршчэўскі, культурна-асветны кіраўнік ГП Валянціна Філіпюк і арганізацыйны кіраўнік Надзя Даніловіч, старшыня Галоўнай рэвізійнай камісіі ГП Міхась Хмялеўскі; прадстаўнікі ПРН у Гайнаўцы: намеснік старшыні Прэзідыума ПРН Вацлаў Цэглярскі, кіраўнік аддзела культуры ПРН Ірэна Дабжанская, кіраўнік аддзела унутраных спраў ПРН Кастусь Бяляўскі, старшыня павятовай рады прафсаюзаў Яраслаў Дабжанскі; прадстаўнікі гайнаўскага аддзела БГКТ: сакратар аддзела Віктар Бура, член прэзідыума аддзела Мікалай Суліма; прадстаўнікі Чыжоўскай гміны: начальнік Мікалай Леўчук, старшыня гміннай рады нарадовай Лявон Карнілюк, сакратары гміннага камітэта ПАРП Юрка Койла і Сцяпан Кот, старшыня гміннага камітэта Фронту адзінства народу Сяргей Насовіч і іншыя мясцовыя актывісты.

Адкрывае ўрачыстасць начальнік гміны ў Чыжах Мікалай Леўчук. Аркестр іграе дзяржаўны гімн Польшчы і Савецкай Беларусі. З дакладам, у якім многа цікавых фактаў аб дасягненнях Савецкай Беларусі, выступае Надзя Даніловіч.

Пасля заканчэння даклада аркестр іграе „Інтэрнацыянал". Затым распачынаецца мастацкая частка.

На трыбуну ўвайшоў гарадоцкі жаночы хор пад кіраўніцтвам Сцяпана Копы і Ніны Мушынскай. Сваім рэпертуарам ён спадабаўся ўдзельнікам фэстына.

Харавы калектыў з Белавежы пад кіраўніцтвам Аляксандра Лукашука таксама захапіў прысутных. Хор гэты ўзмужнеў і ў апошнім часе дабіўся вялікіх поспехаў. Добрыя там галасы, добрыя выканаўцы беларускіх песень. Гэты хор, па-мойму, з вялікай будучыняй.

Цікава прайшла таксама „Згадуй-згадуля" аб Савецкай Беларусі і БГКТ. Добра адказвалі на пытанні і атрымалі ўзнагароды: Людміла Суліма, Станіслаў Устынюк, Васіль Смольскі і Язэп Дмахоўскі. Пасля „Згадуй-згадулі" паявілася на трыбуне танцавальная група з Белавежы, якой кіруе Янка Крупа. Выконвала яна беларускія, польскія і рускія танцы.

Вялікай папулярнасцю карыстаўся „Мікрафон для ўсіх". Першымі былі дзяўчаты з Клейнік Ольга Парфенюк, Зіна Лабузінская і Зося Грыц. Пасля выступіла шмат удзельнікаў фэстына.



„Згадуй-згадуля".

Арганізатары фэстына наладзілі таксама спартыўныя спаборніцтвы ЛЗС на кубак начальніка гміны. Прынялі ў іх удзел тры спартыўныя каманды з Чыжоў, Збуча і Мора. Найлепшымі былі чыжоўцы, і ім начальнік гміны ўручыў кубак.

Паказы мясцовых пажарнікаў таксама выклікалі вялікае зацікаўленне сярод прысутных. Добра і тое, што арганізатары гэтай урачыстасці падумалі аб кніжным кіёску, аб спажывецкіх кіёсках і аб кіёсках з рознымі ласункамі. Фэстын закончыўся вялікай забавай і сяброўскім спатканнем арганізатараў з запрошанымі госцьмі.

Тэкст і фота **Міхася Хмялеўскага**



Удзельнікі фэстына.

ФАЛЬКЛОР

СЯМЕЙНАЯ



Пасеяў бы жыто — німа кому жаці,
А мне маладому ні з кім размаўляці.
А мне маладому ні з кім размаўляці.
— Ой, вазьмі ты, сынку, рубля залатого
І купі ты, сынку, коня вараного.
І купі ты, сынку, коня вараного.
І купі ты, сынку, коня вараного.
Пастаў у стаенцы, размаўляй да ёго.
Пастаў у стаенцы, размаўляй да ёго.
— Конь вады нап'еццa, на салому ляжэ,
А мне маладому праўданькі ні скажэ.
А мне маладому праўданькі ні скажэ.
— Запрагай ты, сынку, коня вараного,
Едзь на Украіну, выбірай дзяўчыну.
Едзь на Украіну, выбірай дзяўчыну.
— Ой, на што мне, мамо, тая Украіна,
Калі ў суседа любая дзеўчына!
Калі ў суседа любая дзеўчына!
— Ні дзівісе, сынку, на чорные брові,
А дзівісе, сынку, на сівые волы.
А дзівісе, сынку, на сівые волы.
— А сівые волы возьмут поздыхають,
А чорные брові нігды ні зліняють.
А чорные брові нігды ні зліняють.

Ад Клаўдзіі Домань, 1912 года нараджэння, і Васіля Доманя, 1902 года нараджэння, вёска Новая Воля Беластоцкага павету, запісаў 22 чэрвеня 1973 года Мікалай Гайдук. З магнетафоннай стужкі нотны запіс зрабіў Эдуард Гойлік.

Чыста ў краме і на... полках

У часе сенакосу прышлося мне наведаць плёскаўскую краму. Відома, людзі не мелі часу едзіць за хлебам, булкамі, півам ці аранжадай у горад. А пры цяжкой рабоце хочацца і трэба добра і смачна з'есці, ды піць пры такой жарышчы хочацца, хочацца.

У краме была чысціня і парадак. За прылаўкам стаяў малады хлапец, таксама акуратна апрануты і ветліва адказваў на маё „ці ёсць..." — „на жаль, няма". На большасці полак было пуста. Хлеба і булак, праўда, прывезлі, але так мала, што я толькі паспела пачуць, што новы тавар у краме, нат веласіпедам не паспела прыехаць і купіць хлеба і булак. А дражджэй таксама няма, вось і еш сабе на здароўе чорны і цвёрды, як камень, хлеб, спечаны тры тыдні таму назад.

Гавораць, што новы прадавец не абазнаны са сваёй працай, і таму такія непаладкі. Трэба было б як мага хутчэй упарадкаваць справы ў плёскаўскай краме. Трэба ж дапамагчы людзям, якія цяжка працуюць у жніво. (на)

МАТАРОЛЕРЫ З КНІЖАК ПКО

У розыгрышы ў Варшаве прыняло ўдзел 21.240 кніжак па 500 зл. Выйграна 16 матаролераў. З Беластоцкага ваяводства выйграў уладальнік кніжкі ў Элку.

Дагэтуль уладальнікі такіх кніжач ПКО ў Беластоцкім ваяводстве выйгралі 44 матаролеры. (вл)



СПАБОРНІЦТВЫ НА „СЯРЭБРАНЫ МУШКЕТ"

У Бельску Падляшскім адбыліся спаборніцтвы на „сярэбраны мушкет", у якім прымала ўдзел 13 каманд з ліцэяў і сярэдніх прафесіянальных школ з паветаў: Сямяціцкага, Гайнаўскага і Бельскага. Першынство заваявалі хлопцы з Гайнаўскага ліцэя, сярод жаночых каманд — дзяўчаты з Сямяціч. Індывідуальна найлепшымі былі вучні з бельскіх школ: Антаніна Шымчук з Эканамічнага ліцэя і Павел Гуральчук з Агульнаадукацыйнага ліцэя. (ця)

Адпачынак у сяброў

Амаль месяц адпачываюць на Беласточчыне дзве групы школьнікаў з Савецкага Саюза. Адна з груп размясцілася ў вёсцы Старына Гайнаўскага павету, у вясковай школе. Тут ужо не першы год арганізуюцца летнія калоніі для польскіх дзяцей, але госці з Беларусі адпачываюць тут упершыню.

Школа ў Старыне выдзяляецца як культурны цэнтр на цэлую акругу. Тут і спартыўныя пляцоўкі, і веласіпеды, і нават свой плавацельны басейн. Жывецца тут весела, цікава і сапраўды, як дома. У калонію прыязджаюць часта вясковая моладзь і дзеці. Завязваюцца розмовы, а потым і сяброўства. Неяк незвычайна здаецца пагаварыць на роднай мове за граніцай. І таму такія гутаркі вельмі частыя. Першым, хто наведаў нашу калонію, быў малады гаспадар са Старыны Віктар Варунь. А цяпер вясковых хлопцаў і дзяўчат прыходзіць многа.

Варта адзначыць, што нам падрыхтавана разнастайная і цікавая праграма. Мы ўжо пабывалі ў Варшаве, Белавежы, Аўгустове. Кожны з нас атрымаў падарункі ад сваіх польскіх сяброў і ад арганізацый Беластока, што запрасілі нас на адпачынак.

Шмат гасцей прыязджае зараз у Старыну. Мы сустракаліся з работнікамі партыйных органаў Беластока і Гайнаўкі, органаў асветы, прафесіянальных саюзаў, прадстаўнікамі Падляшскага будаўнічага прадпрыемства электрычнай інсталяцыі ў Беластоку. Нядаўна наведала дэлегацыя з Савецкага Саюза, якую ўзначальваў сакратар Гродзенскага абкома КП Беларусі А. І. Ульяновіч.

Цудоўны адпачынак атрымалі мы на Беласточчыне. Шчырае дзякуй за гэта.

Павел Шаўчук,

кіраўнік групы савецкіх школьнікаў, старшы рэдактар студыі тэлебачання ў Гродна

КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ З ГРОДНА



Ёсць у нашых мясцінах урочышча пад назвай Бумехі. Калісьці мой бацька меў там кавалачак зямлі. Палі тут з пагоркамі — фурманкай на самую гару не заедзеш. Снег з іх сыходзіць хутка, і жыхары нашых Самаравіч зазвычай пачынаюць вясной менавіта тут палявыя работы. Калі мне было 13 год, бацька ўзяў з сабою туды і мяне. Калі я глянуў з гары ўніз, то ўбачыў, як па схілах высокіх пагоркаў брылі за плугамі, паганяючы коней, чалавек дзесяць ці пятнаццаць. Сярод іх былі не толькі мужчыны, але і жанчыны з дзецьмі — усе басяком, апранутыя ў абы-што. Кожны пахаў сваю вузенькую палосачку, і ад мноства межаў, парослых пустазеллем, поле здалося мне нейкім смутным, параненым. У той дзень праклаўў на ім сваю першую баразну і я...

Пасля яшчэ не раз мне даводзілася працаваць у Бумехах, але той, першы, я запомніў на ўсё жыццё.

І вось нядаўна, у сёлетнюю пасяўную, забрыў я ізноў на той пагорак, з якога дваццаць пяць гадоў таму назад назіраў карціну, якая так узбударажыла мае юнацкія ўяўленні. Вы, зразумела, здагадаліся, што я тут убачыў. Так, на месцы былых палосак-барознаў прасціраліся шырокія палі, а на іх, куды ні глянь, трактары, аўтамашыны, сеялкі і іншыя агрэгаты...

Гэтаму індустрыяльнаму кавалачку нашага самаравіцкага жыцця, уласна кажучы, я не здзівіўся. Здзівіўся толькі тады, калі ўбачыў, што добрай паловай працуючай пад пагоркам тэхнікі кіравалі тыя самыя людзі, якія чвэрць стагоддзя таму назад паганялі тут коней, палівалі гэту зямлю сваім потам. Я маю на думцы Язэпа Купрыянчыка, Уладзіміра Валюка, Генадзя Каленка...

Іх біяграфія — гэта біяграфія пасляваенных Самаравіч, нашага калгаса. Вось Язэп Купрыянчык. Нарадзіўся ён у гэтых месцах, з малых гадоў на зямлі. Яму было цяжэй, чым нам. Яго бацька загінуў на фронце. Як старэйшы з мужчын у сям'і, ён рана ўзяў на сябе клопаты аб ёй. Арганізаваўся калгас — набыў спецыяльнасць механізатара шырокага профілю, і цяпер калі трэба на трактар — працуе на ім, наступае ўборка — садзіцца на камбайн. Ён лепшы механізатар перадавога ў калгасе звяна, на чале якога ён стаіць ужо некалькі год.

Уладзімір Валюк... яго бацька знаны быў у акрузе як дасканалы каваль, а сын вядомы тым, што дасканала ведае любую сельскагаспадарчую машыну. Ды ці толькі машыну! Трэба адрамантаваць тэлевізар ці халадзільнік — таксама зробіць.

Да гэтага часу я не гаварыў аб тых пераменах, якія пераўтварылі нашы Самаравічы. Не таму, што гэтых перамен у нас менш, чым дзесьці. І ў нас амаль усе вуліцы забудаваліся нанава, у хатах сучасная мэбля, тэлевізары, газавыя пліты. А ўсё ж, галоўнае, мне думаецца, у тым, што змянілася сацыяльнае аблічча сяла, увесь духоўны свет селяніна. Чэсна гаворачы, я не бачу, у чым бы нашы людзі ўступалі цяпер гаражанам.

А быў жа час, калі нам здавалася, што зраўняць узровень жыцця горада і вёскі, культурнае аблічча гаражаніна і селяніна — калі і ажыццявімая справа, то вельмі і вельмі далёкай будучыні.

Многія памятаюць, як на вёсцы даражылі натуральнай аплатай. Як з недаверам сустрэлі грашовую. Зразумела, гэта адбывалася паводле сялянскай псіхікі: поўныя каморы — значыцца, пражывем, бяды не будзе. А аб тым, як гэта было клапатліва, ніхто і не задумваўся. Ну, а паспрабуйце цяпер вярнуць сялян да старога: да тых самых пудоў хлеба, бульбы, гародніны, што атрымліваў ён калісьці на працадні. Кожны скажа: атрымаю я лепш грошы, прыкуплю ў калгасе сотню-паўтары кілаграмаў збожжа ды пару пудоў гародніны — і дастаткова. Селянін пераканаўся ў сапраўднай гарантыі грашовай аплаты.

Раздумваючы аб пройдзеным намі шляху, я прыходжу да думкі: іншымі сталі нашы людзі, не падобная на ранейшую самаравіцкая зямля, змянілася, як і ўрочышча Бумехі. Па-мойму, гэта таму, што кожны наш калгаснік з поўным правам можа сёння сказаць: „Гэта — мая зямля..."

А. Жамойцін,
Герой Сацыялістычнай Працы, загадчык вытворчым участкам калгаса „Прагрэс" Зельвенскага раёна.



Льюцца над Нёманам песні. На здымку — вакальная група Гродзенскага нітачна-прадзільнага камбіната.

Фота А. Перахода



ЯК ЗВАРЫШ, ТАК І З'ЯСІ

ВІШНІ

Вішні, якія мы спажываем, альбо з якіх робім запасы на зіму, павінны быць спелыя і здаровыя. Вішні, праўда, не маюць замнога вітаміна С, аднак маюць шмат жалеза, кальцыя, фосфару, ды і наогул вельмі смачныя. Так што раім ужываць іх як найбольш.

ВІШНІ Ў БУТЭЛЬКАХ

Вішні без костачак прапусціць праз мясарубку. Атрыманую пасту падагрэць аж да кіпення. Напоўніць атрыманай масай бутэлькі, альбо слоікі-вэкі і паставіць іх у ваду для пастэрызацыі. Паўлітровы посуд трэба абагравацъ каля 15 мінут, а большы — крыху даўжэй.

ВІШНЁВЫ ДЖЭМ

На кілаграм вішань без костачак трэба ўзяць 70 дэкаў цукру. Вішні засыпаць цукрам у шырокай каструлькі і падагравацъ на малым агні, пакуль аж яны не закіпяць. Ад часу, калі ўжо закіпяць, варыць 25 мінут, збіраючы зверху пену. Гарачы джэм злажыць у слоікі і закрыць іх.

ВАРЭННЕ З ВІШАНЬ

Кілаграм вішань без костачак патрабуе 1,10 кг цукру. Вішні засыпаць цукрам, паволі падграваючы, пакуль яны закіпяць. Праз 5 мінут кіпячэння — варэнне зняць з агню. На наступны дзень закіпяціць і ад гэтага часу варыць яшчэ мінут 20. Гарачае варэнне злажыць у слоікі і шчыльна закрыць.

ВІШНЁВЫ СУП

На 40 дэкаў вішань трэба ўзяць 1,5 літра вады, шклянку смятаны, лыжку мукі і цукар па смаку. Памытыя і ачышчаныя ад костачак вішні крыху падварыць, працэрці праз друшлак. Атрыманую масу запраўляць смятанай з мукой, закіпяціць, пасаладзіць па смаку. Падаваць гэты суп можна з клёцкамі з мукі, з грэнкамі, альбо з прэпараваным рысам.

АЛАДКІ З ВІШНЯМІ І АБРЫКОСАМІ

На адну шклянку кіслага малака трэба ўзяць дзве шклянкі мукі, 2 яечкі, адну лыжку алею, соль, чвэрць лыжачкі соды, вішні і абрыкосы. Малако разам з жаўткамі, алеем і мукой вымяшаць, дадаць соду і пену з бялкоў. Абрыкосы нарэзаць на палавінкі, пасля на чвэрткі, з вішань выняць костачкі. Вішні і абрыкосы палажыць у атрыманае цеста і добра вымяшаць. Смажыць невялікія аладкі на разагрэтым тлушчы. Падаючы, не забыцца пасыпаць цукровай пудрай.

У канцы мы хацелі б даць яшчэ адну раду. Усе запасы на зіму з вішань трэба рабіць, вымаючы з іх костачкі, паколькі ў іх знаходзіцца шкодныя для здароўя рэчывы, якія часткова пранікаюць у варэнне ці кампот.

Гаспадыня



— Але ж Клец і Мельцар пакуль не ведаюць аб гэтым. — Мішэль разліў каву ў вялікія кубкі. Зноў настала маўчанне.

— Так, — нарэшце, сказаў Лібель, — трэба выйграць час. Мы таксама не ведаем, што яны думаюць цяпер зрабіць. Дарэчы каторая гадзіна? Ужо дзесяць? Нам трэба далажыць аб тым, як ідуць пошукі Шварцбрука.

Ён выйшаў у суседні пакой да тэлефона.

Застаўшыся адзін, Мішэль узяў са стала пасведчанне на імя Віліса Дуціса і доўгі час разглядаў фатаграфію.

Неўзабаве вярнуўся Лібель.

— Клец патрабуе, каб я неадкладна з'явіўся да яго. Я паеду. — Обер-лейтэнант пераклаў пісталет з задняй кішэні ў бакавую. — А ты падрыхтуйся да нашага першага варыянту, аб якім мы гаварылі раніцай. Чакай званка!

ІААХІМ КЛЕЦ РОБІЦЬ ПОДЗВІГ

Выклікаўшы Лібеля, Клец грымнуў трубкай аб апарат і замітусіўся па бункеры.

Вось калі пачаўся сапраўдны спектакль! Мельцар, усеўшыся зручна ў крэсле, моўчкі назіраў за ім. Іаахім Клец у наступныя паўгадзіны паспеў выпусціць увесь вялізны запас лаянкі, які яму ўдалося сабраць у час яго паліцэйскай службы ў гамбургскіх трушчобах. Ён пачаў паўтарацца ўжо, калі ў дзвярах бункера з'явіўся бледны і сур'ёзны обер-лейтэнант Лібель. Клец змоўк. Пры падначаленым ён зноў авалодаў сабой.

— Дакладвайце ўсё і наколькі можна больш падрабязна, — сказаў ён. — Што вы зрабілі, каб знайсці Шварцбрука?

Обер-лейтэнант нетаропка расказаў аб усім, што адбылося на станцыі Зосен.

— Такім чынам, — закончыў ён, — я ўпэўнен, што ў гэтай паніцы гаўптман Шварцбрук, не дачакаўшыся мяне, паехаў у Берлін.

— Хто гэта можа пацвердзіць? — Клец пераходзіць ужо на тон допыту.

Кандуктар чацвёртага вагона, затым паранены ў шпіталі і — найбольш каштагарычна — пан Гарднер, адрас якога я магу вам даць, — Лібель падышоў да стала і паклаў перад Клецам лісток з блакнота.

Клец узяў яго і спытаў:

— Ну, а што ж вы зрабілі далей, обер-лейтэнант?

Лібель стомлена ўсміхнуўся.

— Далей, пан оберштурмбанфюрэр, справа часу. Там ля самай станцыі ёсць пост фольксштурма. Стары фельдфебель і з дзесятак хлапчукоў, але яны робяць карысную справу, у іх запісаны ўсе нумары машын, якія праходзяць праз іх пост у Берлін. У цікавячы нас адрэзак часу прайшло дванаццаць машын. Сем з іх я ўжо адшукаў, але пакуль безвынікова. Вы выклікалі мяне ў той момант, калі я ўжо амаль знайшоў восьмую.

Мельцар пераможна паглядзеў на Клеца. Ну што? Якія людзі абвера?!

— Павінен вам сказаць, — працягваў Лібель, — што фатаграфія або апісанне знешняга выгляду гаўптмана значна аблегчылі б мне пошукі, сэканомілі б час. Я паказаў бы фатаграфію вадзіцелям або мог бы ім расказаць, як гэты Шварцбрук выглядае.

— Я ўжо гаварыў вам, Лібель, — голас Клеца зноў набыў лісліваць, — што ў нас няма яго партрэта. Я спрабаваў знайсці тут чалавека, які асабіста знаёмы са Шварцбрукам, але і такога не аказалася. Ён знаходзіўся ў распараджэнні франтавой разведкі. Спрабавалі звязацца з франтам, але ж цяпер такі час! — Клец безнадзейна махнуў рукой. — Я прашу вас толькі ўлічыць, што ў нашым распараджэнні застаецца гадзіны тры-чатыры. Па загаду генерала Крэбса Шварцбрук павінен вылецець не пасляза ўтра, а сёння ноччу.

— Я думаю, што нам не варта нічога ўтойваць ад нашага афіцэра, — сказаў Мельцар, звяртаючыся да Клеца. Той моўчкі кіўнуў галавой. — Сёння днём наш оберштурмбанфюрэр памылкова далажыў генералу Крэбсу, што Шварцбрук ужо ў Берліне і шчасліва адпачывае, пан оберштурмбанфюрэр. Прашу насцць становішча?

Лібель замест адказу выцягнуўся ў струнку. Клец таксама ўстаў, папраўляючы на сабе мундзір.

— Я паеду на пошукі з вамі, Лібель, — сказаў ён. — Я пакажу вам, як трэба працаваць! Давайце сюды спіс нумароў машын!

Обер-лейтэнант нацягнута ўсміхнуўся і дастаў з кішэні яшчэ адзін лісток з блакнота.

— Буду рады выпадку павучыцца ў вас, пан оберштурмбанфюрэр. Прашу прабачэння, я толькі вып'ю шклянку вады, у мяне перасохла ў горле.

Клец і Мельцар схіліліся над спісам. Першыя сем нумароў у ім былі закрэслены.

— Гэтыя я праверыў ужо, — сказаў Лібель, заглядваючы цераз плячо. — Ніхто з іх капітана не бачыў.

— Каму належаць астатнія пяць?

— Гэтага я яшчэ не высветліў.

Клец паглядзеў на Лібеля з яўным спачуваннем.

— З вас, обер-лейтэнант, ніколі не

ТРЫБУНА чытачоў

Майстар сельскагаспадарчай прадукцыі

Малады гаспадар Яўгень Тарасюк, што жыве на калоніі Хорашчава Мілейчыцкай гміны, гаспадарыць на 8,39 га зямельных угоддзяў. Ён закончыў сельскагаспадарчы тэхнікум і ў гадах 1969—70 прайшоў практыку як заатэхнік гміннай сельскагаспадарчай службы ў Мілейчыцах. Аднак работа гэта маладому тэхніку не вельмі спадабалася. Ён звольніўся з пасады заатэхніка і пайшоў працаваць на бацькоўскую гаспадарку. За некалькі гадоў ён дасягнуў вялікіх поспехаў у зернавых і жывёлагадоўлі. Дзякуючы ўмеламу прымяненню навейшых агратэхнічных ведаў, ён дасягнуў 45 цэнтнераў пшаніцы з гектара. А сярэдняя чатырох збожжавых была 33 цэнтнеры з га. Прадукцыя мяса — 250 кг на кожны га ўгоддзяў. Гэта прыклад добрай работы, з якой карысць мае і дзяржава і гаспадар, які ў гэтым годзе купіў новы трактар „С-330" і легкавую аўтамашыну „Варшава".

Тэкст і фота **Сяргея Крэйзы**



Яўгень Тарасюк (злева) з прадстаўніком гміннай сельскагаспадарчай службы сябрам Юрчуком у сваёй пшаніцы.



ЛІЕТО

Ліето прышло, заспівалі пташкі,
Сталі трудітсе малые мурашкі,
Шчэбэт у ліесі, шчэбэт у полі,
Якого нэ чулі досюль ніколі.

Зэлёны ліес, трава ўжэ зэлёна
Ходіў віетёр і ходіт ў коронах
Тіешыцце зэмля, тіешацце людэ,
Што ліето зноў, тэпло будэ.

У жіті зноў цвітэ дворанінэць
Запылітся от жары наш госцінэць.
Стадо смачну траву будэ есці,
Пастух оддыхнуті захочэ сесці.

Што здроёва ў рыечці плывэ вода
І што троху, троху будэ ўсім шкода,
Як мінэ мігом, пэруойдэ ліето
І пройдэ осінь золотая над свіетом.

Анна Дэнісюк
Плёскі

выйшла б добрага паліцэйскага дэтэктыва. Вы бралі па адной машыне? Так вы будзеце шукаць капітана яшчэ двое сутак. Запомніце, панове, — Клец звяртаўся ўжо і да Мельцара, — нават самы просты пошук не абыходзіцца без аналізу!

Мельцар кашлянуў і адвярнуўся. А Лібель з зацікаўленым тварам сеў да стала.

Клец набраў нумар тэлефона паліцэйскага ўпраўлення. Абапёршыся аб стол, Лібель бачыў, як ён запісаў на лістку прозвішчы і адрасы ўладальнікаў машын. Лібель з непадробнай цікавасцю даведаўся, што першыя дзве машыны легкавыя і адна з іх належыць урачу, другая адвакату, затым у спісе ішоў грузавік, які абслугоўвае фірму „Браты Заўкель", потым фургон з рэстарана і кабарэ „Мядзведзь" і, нарэшце, грузавік кампаніі „Нектар" (вытворчасць харчовых канцэнтратаў).

Пагаварыўшы з паліцыяй, Клец задумаўся.

— Можа нам усё-такі пачакаць? — спытаў Мельцар. — Я думаю, к раніцы Шварцбрук з'явіцца.

— Ва ўсялякім разе, мы нічога не губляем, калі паспрабуем, — адазваўся Лібель. — Пан оберштурмбанфюрэр мае вопыт у такіх справах.

— Ну, у такім разе дзейнічайце, панове, жадаю поспеху. — Мельцар выйшаў.

(Працяг будзе)

БУДЗЕ КРАМА

Як вядома, у Тапчыкалах няма крамы, а спажывецкага кіёска людзям замала.

Начальнік гміны ў Орлі і ўлады ГС-у склікалі вясною сход. На ім усе прынялі пастанову, каб адбудаваць адзін закінуты будынак (ёсць такі ў вёсцы). Быў выбраны камітэт будовы і праца пайшла адразу. Член камітэта Іван Сікора на пачатку гаварыў, каб выкарыстаць час, бо калі прыдзе жніво, тады будзе цяжка.

Наглядальнік

Ад рэдакцыі: Просім нашага карэспандэнта напісаць пра далейшую сітуацыю на будове крамы ў Тапчыкалах. Калі новая крама прыступіць да продажу?

Такі ён механік!

Тэхніка ідзе наперад. Амаль кожны з маладых мае цяпер уласны матацыкл, або матаровер. Кожная мажына, вядома, часам псуецца. Бывае, што сапсуецца дробная частка ў машыне. Не кожны сам умее направіць сваю машыну. Дзяржаўных пунктаў рамонту ў нас няма. Таму цягнуць людзі да прыватных механікаў і тады грошы з кішэні ідуць, як вада. Ёсць розныя механікі — і лепшыя, і горшыя, але ёсць і паскуднікі. Да апошніх належыць механік у Кляшчэлях Гайнаўскага павету. Называецца Войцех Грэнь.

Па-першае, ён не ўмее рамантаваць, а па-другое — махлюе. За дробязь бярэ 600—700 зл. Але пра цану скажа тады, як „наладзіць". А спачатку заахвочвае чалавека, называе невялікую цану. Калі прыдзе аднак час расплаты, заспявае так, што чалавек гатовы адрачыся матацыкла. Ці хоць добра адрамантуе, спытаеце? О, не! Два-тры дні, а найбольш два тыдні шафёр паездзіць „адрамантаванай" у Грэня машынай, а потым клёпс — ні ўперад, ні ўзад. Вядзе ён зноў сваю машыну да Грэня, каб той направіў работу і, зразумела, без грошай. Ды што? Грэнь не такі, каб без грошай. Гоніць, скача да чалавека біцца. Грэнь не дае нікому гарантыі сваёй работы. Але і работы добрай не дае.

Мікалай Панфілюк



ДАРАГОЕ „СЭРЦАЙКА"!

Я служу ў войску. Ужо засталося некалькі месяцаў да канца службы. Яшчэ перад войскам пазнаёміўся я з дзяўчынай з суседняй вёскі. Было ёй тады 16 год. Ужо амаль тры гады, як мы з ёй ходзім. Калі я адыходзіў у войска, бацькі мае зрабілі вялікую гасціну. Было шмат хлопцаў і дзяўчат. Была і Зіна. Развітваючыся, мы паабяцалі, што будзем чакаць адзін другога, а як толькі я вярнуся з войска, мы пажэнімся. Зіна прыехала нават да мяне на прысягу. Пісалі мы часта пісьмы. Я дамоў ездзіў рэдка, бо служу я даволі далёка, дык з вялікай нецярплівасцю чакаў я яе лістаў. Але вось на апошняе маё пісьмо не атрымаў адказу ад Зіны. Вельмі хваляваўся, але разважаў, што, можа, няма часу, мо захварэла. Усялякія думкі прыходзілі ў галаву. Але нядаўна атрымаў я пісьмо ад калегі. Піша, што чуў, што Зіна мае хлопца, што выходзіць замуж. Не магу паверыць гэтаму. Няўжо Зіна перастала мяне кахаць?! Парай, „Сэрцайка", што мне рабіць? Ці напісаць яшчэ пісьмо да Зіны і запытаць пра ўсё? Ці ўжо ўвогуле не пісаць нічога? З нецярплівасцю чакаю тваёй парады.

Міша — салдат

Міша! Не падай духам! Спрабуй яшчэ раз напісаць да Зіны. Тое, што калега піша, не мусіць быць праўдзівым. Тым больш, што калега і сам не ўпэўнены ў гэтым. Ён толькі штосьці чуў. Калі аднак ізноў не атрымаеш адказу, будзе гэта азначаць, што штосьці між вамі псуецца. Зіна яшчэ даволі маладая, ты далёка, можа, і спадабаўся ёй нейкі хлапец. На жаль, у каханні ўсяляк бывае. І рады на гэта няма. Кахаць ніхто нікога не прымусіць. Але не перажывай! Дзяўчат прыгожых многа, а ты хлопец малады. Жыццё перад табою!

„Сэрцайка"

Пра зязюлю і галубоў

Пачцівая зязюля яшчэ ў мінулым годзе нармальна кукавала ўсю вясну і, як некаторыя кажуць, прарочыла доўгае і шчаслівае нашае жыццё. А ў гэтым годзе ва ўсім Бельску не чутно было голасу зязюлі. Якая прычына? Можна думаць, што старая пташына пражыла свой век, а маладая не знайшла гнязда, куды магла б знесці свае яйкі.

З вялікай аднак прыемнасцю можна паслухаць у тым жа Бельску груканне дзікіх галубоў. Моладзь часта любіць забаўляцца гадоўляй галубоў і таму павінна парабіць адпаведныя скрынкі на гнёзды на высокіх дрэвах у парках і садах, так як гэта робяць для шпакоў. Дзікія галубы, а можа і зязюлі выкарыстаюць гнёзды і вывядуць маладых спевакоў. Сам я бачыў, як галубы вывяліся ў дупле старой грушы.

Павешаныя скрынкі будуць выкарыстаны летам на гнёзды, а зімою ў сцюжу будзе там месца для птушыных начлегаў.

Пакахайце прыроду! Любіце і памагайце птушкам, якія сваім спевам упрыгожваюць наша жыццё.

Нестар Перавой

ПАСЛЯ З'ЕЗДУ ЗБоВіД У САКОЛЦЫ

Сакольскі аддзел ЗБоВіД мае вялікія дасягненні ў працы. Налічвае 993 члены, а было больш тысячы. Частка нашых членаў дзякуючы новаму адміністрацыйнаму падзелу апынулася ў Беластоцкім павеце.

Сакольскі аддзел ЗБоВіД правёў многа лекцый і сустрэч на тэмы рабочага руху ў Польшчы і свеце, барацьбы польскага народа за вызваленне з-пад гітлераўскай акупацыі, партызанскага руху на Беласточчыне, дапамогі Савецкага Саюза Польшчы.

Школьная моладзь і прадстаўнікі сакольскіх устаноў многа дапамагалі бяднейшым членам ЗБоВіД.

У дыскусіі на павятовым з'ездзе дэлегаты дамагаліся карт ветэранаў для членаў ЗБоВіД, зніжак у праездах ПКП і ПКС і іншых ільгот. Прадстаўнік Галоўнага праўлення ЗБоВіД з Варшавы запэўніў нас, што ў XXX гадавіну паўстання Войска Польскага атрымаем карты ветэранаў. З'езд выбраў новыя ўлады сакольскага аддзела ЗБоВіД. Старшынёй зноў стаў Уладзімір Бельскі, а намеснікам Станіслаў Найфелда. Старшынёй рэвізійнай камісіі выбралі Чэслава Тодрыка.

У. Х.



АДКАЗВАЕ ПРАЎЛЕННЕ ГМІНЫ Ў ОРЛІ, БЕЛЬСКІ ПАВЕТ.

Dotyczy: odpowiedzi na informację, opublikowaną w „Niwie" pod tytułem „Niedbalstwo przynosi szkodę"

Urząd Gminy w Orli informuje redakcję „Niwy", że sprawa ułożenia przepustów we wsi Reduty i na odcinku drogi Malenniki—Reduty została omówiona z sołtysem wsi Reduty i termin został ustalony.

Na teren Redut przeznaczono 13 przepustów z czego: 4 przepusty do ułożenia na terenie wsi, zaś 9 do ułożenia na drodze Reduty—Malenniki.

Termin układania przepustów w czynie społecznym we wsi został ustalony na dzień 7.VII.1973 r. Natomiast ze względu na to, że przy układaniu przepustów konieczna jest obecność przedstawicieli PZDL (fachowców) termin ułożenia przepustów na drodze Reduty—Malenniki będzie omówiony z PZDL i Powiatowym Zarządem Gospodarki Wodnej i Melioracji w Bielsku Podlaskim. Przepusty na tej drodze zostaną ułożone w najbliższym czasie.

Do wiadomości:
1. Sołtys wsi Reduty

Sekretarz Biura
Maria Matujewicz

НАША ПОШТА

Аўтара, або аўтараў артыкула „Ці ёсць яшчэ дзе-небудзь так?" просім падаць сваё прозвішча і адрас. Можам яго надрукаваць пад псеўдонімам, але пры ўмове, што сапраўднае прозвішча і адрас рэдакцыя будзе ведаць.

Сябра Я. Грыцук, Ташкент. Дамо, а як жа, здымак, які вы назвалі „Беларусы ў Ташкенце". Такіх іменна кароткіх інфармацый з вашага цяперашняга жыцця пішыце больш. Успаміны „У гасцях на радзіме" таксама надрукуем у „Трыбуне чытачоў".

Васіль Асеннік, Спічкі. Сёння адказваем на вашы прапановы адносна павелічэння аб'ёму „Нівы". Пакуль не маем ніякіх магчымасцей гэта зрабіць. Пакуль што дбайце пра пашырэнне падпіскі „Нівы".

Юрка Панасюк, Бельск. На жаль, дарагі сябра, проста не магчыма было хутчэй адказаць вам. Адносна вершаў: найбольш прадуманы і поўны — гэта „Маладосць", хоць і ў іншых ёсць цікавыя вобразы. Станоўча задоўгі „Цікава". Будзем друкаваць у сваю чаргу.

Ірэна Кузьма, Аднога. Ваш „Адказ Дзядзьку Квасу" неўзабаве надрукуем.

Марыя Кос, Казлы. Сардэчнае дзякуй, што напісалі. Фальклорныя песні нас цікавяць, ды вы пачакайце — прыедзе да вас адзін з нашых рэдактараў, які вашы старыя песні запіша — разам словы і мелодыю — на магнетафонную плёнку. Тады змогуць яны ў нотным запісе пайсці ў „Ніву". А мо б вы пісалі нам пра розныя справы жыцця-быцця вёскі?



ГАЙНАЎСКІ ПАВЕТ

Белавежа
„Rewizja osobista" (polski), 7 -8. „Dwanaście krzeseł" (radz), 9—10. „Niebieski żołnierz" (USA), 11—12

Кляшчэлі
„Che opowieść o Guevarze" (włoski), 7—8. „Wakacje we czworo" (włoski), 9—10. „Dziewczyna z gór" (jugosł). 11—12.

Нараўка
„Małżeństwo" (franc.), „Najlepsza kobieta mojego życia" (czeski), 7—12.

Нарва
„Sokoły" (węgierski), „Kozacy" (radz.), 7—12.

Чыжы
„Na krawędzi" (polski), „Bez wyraźnych motywów" (franc.) 7—12.

Дубічы Царкоўныя
„Czym mogę służyć" (czeski), „Gniewna podróż" (buł.), 7—12.

Арэшкава
„24 godziny z życia kobiety" (franc.), „Małżonkowie roku II-go" (rumuński), 11—12.

БЕЛЬСКІ ПАВЕТ

Орля
Szczęście Anny" (radz.), „Czarodziej Fablo" (franc.), 7—12.

Райск
Okruchy życia" (franc.), „Wydra pana Grahama" (angl.), 7—12.

БЕЛАСТОЦКІ ПАВЕТ

Гарадок
„Bolesław Śmiały" (polski), 11—12.

Міхалова
„Rzeczpospolita babska" (polski), 7. „Dzień oczyszczenia" (polski), 8. „Skąpani w ogniu" (polski), 9. „Pułapka" (polski) 10. „Historia jednego myśliwca" (polski), 11. „Ogniomistrz Kaleń" (polski), 12.

СЯМЯЦІЦКІ ПАВЕТ

Нурэц
„Przepustka na ląd" (radz.), 7—8. „Unkas — ostatni Mohikanin" (rumuński), 9—10. „Oskarżeni o zabójstwo" (radz.), 11—12.

Мельнік
Próba terroru" (czeski). 7—8. „Pod prąd" (węgierski), 9—10. „Poszukiwany — poszukiwana" (polski), 11—12.



Organ Zarządu Głównego Białoruskiego Towarzystwa Społeczno-Kulturalnego. Wydawca: Białostockie Wydawnictwo Prasowe RSW „Prasa-Książka-Ruch". Redaguje Kolegium. Adres Redakcji: Białystok, ul. Wesołowskiego 1. Numer przy przesyłkach pocztowych: Redakcja tygodnika „Niwa", Skr. poczt. 281, 15-950 Białystok. Telefony: Redaktor Naczelny i Sekretarz Redakcji 2-10-33, publicyści 2-32-41 do 45 (centrala). Cena prenumeraty krajowej: rocznie: 28,80 zł, półrocznie: 14,40 zł, kwartalnie: 7,20 zł. Prenumeraty przyjmowane są do dnia 10 każdego miesiąca poprzedzającego okres prenumeraty. Prenumeraty na kraj dla czytelników indywidualnych przyjmują Urzędy Pocztowe oraz listonosze. Można również wpłaty na prenumeratę indywidualną dokonywać na konto I Oddziału Rejonowego „Ruch" w Białymstoku 150-6-161 NBP I OM Białystok. Na odwrocie blankietu należy podać okres prenumeraty i tytuł zamawianego pisma. Wszystkie instytucje państwowe i społeczne w miastach, zamawiają prenumeratę wyłącznie za pośrednictwem Oddziałów i Delegatur RSW „Prasa-Książka-Ruch". Pozostałe — mające siedzibę na wsi lub w innych miejscowościach, w których nie ma Oddziałów i Delegatur zamawiają prenumeratę za pośrednictwem Urzędów Pocztowych. Prenumeratę na zagranicę przyjmuje: RSW „Prasa-Książka-Ruch", Biuro Kolportażu Wydawnictw Zagranicznych, Wronia 23, 00-840 Warszawa. Konto PKO Nr 1-6-100024. Cena prenumeraty dla zagranicy jest wyższa od prenumeraty krajowej o 40 proc. Nr indeksu 36911

BZGraf. Nakład 6769 K-1

ПРАДКАЗАЛА...

Лёнька Бабок быў у добрым настроі. Ён атрымаў аванс, прыняў удзел у апераццы „на траіх" і лагодны, цёпленькі, прахаджваўся па пероне ў чаканні цягніка.

Усё навакол было ў мяккіх, ружовых фарбах. І дрэвы, і вараб'і, і людзі. Нават пажылая цыганка ў пышнай квяцістай кофце здалася яму дужа прыгожай.

— Дай, саколік, ручку — паваражу: пра мінулае скажу, будучае прадкажу, думкі твае ўгадаю, — пявуча і складна звярнулася цыганка да Лёнькі.

„А чаму б і не паваражыць? Мо і сапраўды што скажа і прадкажа?" — падумаў Лёнька і нерашуча працягнуў руку варажбітцы. Тая ўчапілася за руку і пацягнула Лёньку ў бязлюдны завулак. Там, перш чым варажыць, прапанавала:

— Улагодзь ручку, саколік!

— Заплаціць, значыць? — паспрабаваў здагадацца Лёнька.

— Не, — запярэчыла варажбітка, — разлічымся з табою пасля варажбы. А цяпер проста пакладзі на руку дзесяць злотых.

Лёнька паклаў грошы. Варажбітка спрытна пераклала іх у левую руку і сказала:

— Цябе ў бліжэйшы час чакае непрыемнасць. Цяпер дай трыццаць і я скажу, чым яна скончыцца.

Калі Лёнька паклаў грошы, варажбітка вярнула яму дзесяць.

— А цяпер пяцьдзесят.

Лёнька паклаў пяцьдзесят і атрымаў трыццаць з чарговай прапановай:

— А цяпер — сто!

Лёнька паклаў сто. Грошы імгненна зніклі ў глыбокай кішэні варажбіткі. Лёнька кінуўся адбіраць свае грошы.

— Ратуйце! Гвалтуюць! — залямантавала варажбітка і з сілай рванула сваю квяцістую кофту... Лёнька куляй выскачыў з завулка і паімчаўся па вуліцы. А ўслед яму крычалі:

— Трымай! Лаві!

Крыкі множыліся і няўмольна набліжаліся. Калі ж у гэтым лямансе Лёнька пачуў пранізлівы міліцэйскі свісток, то адразу зразумеў: уцячы не ўдасца.

Так і здарылася: Лёньку за свае ж грошы і за ўласнае глупства давялося апраўдвацца ў міліцыі... Выходзіць, прадказала варажбітка, што будзе непрыемнасць.

Мікалай Янчанка

Без слоў.

ЯКІЯ СЛОВЫ

Прафесар: — Якія тры словы студэнт ужывае найчасцей?

Студэнт: — Я не ведаю.

Прафесар: — Правільна!

НІЎКА

НА ПАХМЕЛЛЕ

Адзін выпівоха чуць свет прачнуўся ды гукае:

— Кума! Наліце шклянку гарэлкі!

— Няма гарэлкі, — адказала жонка.

— Ну дык піва.

— Няма і піва.

— А дзе ж гэта я?

— Дома, ідале, дома.

— А-а-а... Тады падай вады.

ДБАЙНЫ СЫН

— *Што ты з заробленымі грашыма робіш, Пятрук?*

— *Тое-сёе куплю, у рэстаран схаджу, а што застаецца — бацькам пасылаю.*

— *І многа ўжо выслаў?*

— *Ды пакуль што нічога не заставалася.*

ГУМАР З

ШТО ЗРОБІШ

Суддзя. Жонка ваша кажа, што вы яе пабілі ў нядзелю.

Муж. Ваша высакароддзе, што зробіш, у будні дзень часу няма біць.

На прагулцы.

МІНІБАЙКІ

КОНЬ І АВАДЗЕНЬ

Конь-ламавік цалюткі дзень
Цягаў вазы, што сілы...
Аднекуль „дзынь-дзынь" Авадзень.
І сеў Каню на спіну.
А ўжо назаўтра, чуем, днём
Размовы йдуць такія:
Той Авадзень удвух з Канём
Вазіў вазы цяжкія.

Пятро Перац

АПТЫМІСТКА

Дзве жабы, трапіўшы ў пуза змяі, абмяркоўвалі сваё складанае становішча.

— Нам чартоўскі не пашанцавала, — сказала сумна адна.

— Не спяшайся з вывадамі, — спыніла яе другая. — Затое ў нас ёсць і ежа і дом.

— Гэта правільна, — згадзілася першая жаба, — жыллём мы абяспечаны на ўсё жыццё, але не бачу, дзе ежа.

— Ну ж ты і буркуха! — з дакорам заўважыла ёй сяброўка. — Мы і ёсць ежа.

А. Бірс

ШТО ЯШЧЭ?

Галівудская актрыса прыйшла да псіхіятра са скаргай на дэпрэсію. Лекар параіў ёй змяніць спосаб жыцця і перамяніць абставіны.

— *Доктар, — уздыхнула зорка, — за апошнія гады я змяніла сем аўтамабіляў, пяць кватэр, дванаццаць прад'юсераў, шэсць мужоў і шматразова колер валос. Скажыце мне, што яшчэ я павінна змяніць?*

ЁН ВЕДАЕ...

— Паслухай, Люся, чаму ты пасварылася з Кастусём?

— Таму, што ён ведае масу непрыстойных песенак!

— Ды ён што, спяваў іх табе?

— Не, насвістваў.

НЕ МОГ ПАЧАКАЦЬ

Адна жанчына скардзілася суседцы:

— Ваш сын абарваў усе грушы у маім садзе. А яны яшчэ ж зусім зялёныя!

— Вось паскуднік! Не мог пачакаць пакуль даспеюць.

ВЕЛЬМІ ЦІКАВА

Аўташкола выпусціла вялікую групу шафёраў. З прамовай выступіў дырэктар, павіншаваў з паспяховым заканчэннем навучання. Потым курсантам уручылі пасведчанні. Ужо мелі разыходзіцца, калі падняў руку адзін з новаспечаных шафёраў і сказаў:

— Выбачайце, пане дырэктар, але мяне вельмі цікавіць, чаму яна ўсё-такі едзе, гэта машына?

ВЫТЛУМАЧЫЎ

Ловіць хлопец рыбу, аж ідзе дзядзька і пытае:

— Ну як, рыба не зрываецца?

— Ды калі як. Калі выцягну на бераг, дык не зрываецца, а як яшчэ да берага цягну, дык бывае, што і зрываецца.

ЗГОДНА З НАВУКАЙ

Прыслалі ў вёску новаспечанага заатэхніка. Падыходзіць да яго загадчык птушкафермы.

— Парайце, што рабіць? — гаворыць. — Што ні дзень — куры здыхаюць і здыхаюць.

— А вы іх чым корміце? — пытае заатэхнік.

— Ды чым давядзецца. То ячменем кормім, то аўсом.

— Гэта дрэнна. Згодна з навукай, іх трэба карміць просам.

Праходзіць некалькі дзён.

— Зноў здохла сто пяцьдзесят кур, — заяўляе заатэхніку загадчык фермы.

— А якою вадою вы іх поіце?

— Звычайнай, з калодзежа.

— Гэта вельмі дрэнна. Згодна з навукай, курэй трэба паіць толькі цёплай вадой.

Праходзіць тыдзень.

— Здохла яшчэ сотня курэй, — рапартуе загадчык фермы. — Вашы парады нешта не памагаюць. Мо навука ведае якія-небудзь рэкамендацыі лепшыя?

— Паслухайце, дарагі мой, — адказвае новаспечаны заатэхнік. — Навука мае яшчэ мноства радыкальных рэкамендацый, але вы спачатку скажыце, ці многа ў вас на ферме курэй засталося?

— *Гэта тыя тры дні, калі не было піва.*

— *Рацыяналізацыя.*

ПЕСНІ ПА ЗАЯЎКАХ

Па просьбе Сымона Васілюка з Плютыч Бельскага павету змяшчаем песню з рэпертуару „Чырвоных гітар"

Wróćmy na jeziora

Kiedy wrócą ptaki do mazurskich gniazd,
Ruszaj tam — gdzie już żeglarze płyną szlakiem gwiazd.
Wróćmy na jeziora, na wędrowny rejs.
Znajdziesz tam cel swojej drogi, wśród szumiących drzew.

Białe żagle, szmaragdowa toń.
A przy tobie przyjacielska dłoń (bis).

Wrócisz tam z gitarą, gdzie ogniska blask.
Zostań tu — noc śpi w szuwarach, pieśni słucha las.
Wróćmy na jeziora, na samotny brzeg.
Zostań tu, gdzie las i woda, masztów cichy śpiew.

Białe żagle, które kryje mgła.
I nie mów nic — bo przygoda trwa. (bis)

Wróćmy na jeziora, gdy zapadnie mrok.
Znajdziesz tu swoją przygodę,
Wrócisz tu za rok...

Чаго ў спорце не бывае!

МАЎЧЫ ЗА СТАЛОМ

Селі абедаць, а хлопец:

— Мама...

— Маўчы за сталом! — спыніў бацька і ляснуў сына лыжкаю па лобе.

Паабедалі. Маці пытае ў хлопца:

— Што ты хацеў сказаць?

— У мяне лыжкі няма...

ІГРА НА СКРЫПЦЫ

Жонка мые посуд, а муж — на балконе.

— Што ты робіш? — пытае жонка.

— На скрыпцы іграю!

— А я падумала, што ты нажку стала адпільваеш.

НЕРАЗЛУЧНЫЯ

Цёмнай вуліцай, абняўшыся, ідуць двое п'яніц.

— Дружа, падтрымай мяне, каб я тут не ўпаў! — кажа адзін.

— Э, не, як ты ўпадзеш, дык і я ўпаду. Я цябе тут самога не пакіну.

...Ён і па тэлефону можа ўваткнуць нож у спіну.

...На суд нашчадкаў ён надзей не пакладаў: ведаў, што рашэнне будзе не на яго карысць.

КУРЁЗЫ

ЗАЖМУРЫЎШЫ ВОЧЫ

У якой толькі паставе не даводзілася працаваць рэпарцёру, каб атрымаць удачны здымак! Швед Оле Сюндб'ю, напрыклад, здымае пейзажы ў Лапландыі з верталёта, учапіўшыся рукою і нагою за вяровачную драбіну.

— Як вы выглядаеце аб'ект на зямлі? — спыталі Сюндб'ю, здымкі якога былі прызнаны найлепшымі працамі года, студэнты-журналісты.

— Выглядаю? Ды я ад страху вачэй адкрыць не магу! — адказаў маэстра.

ПРЫВІД НА ПАСТУ

У бразільскім штаце Сан-Паўлу, дзе шафёры слывуць з анархічнасці, праведзена кампанія за бяспеку вулічнага руху. Улады падтрымліваюць усялякую ініцыятыву і выдумку пешаходаў і ім падобных, калі яна прымушае шафёраў быць больш уважлівымі і асцярожнымі за рулём. Першае месца атрымаў вынаходлівы веласіпедыст, які пераадзеўся за прывіда, спадзеючыся, што можа гэта ўселіць асцярожнасць у шафёраў і ўстрымае іх ад жадання яго задушыць...

СМЯЕМСЯ З НАМІ

Насуперак усім законам фізікі чуткі распаўсюджваюцца хутчэй гука.